Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 чэрвеня 2014 г. ПЯТНІЦА № 104 (27714) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У МІРЫ І ЗГОДЗЕ!

*Арганізатарам, удзельнікам і гасцям X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур*

Паважаныя сябры!

Сардэчна вітаю арганізатараў, удзельнікаў і гасцей X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

За многія стагоддзі на беларускіх землях сфарміраваўся ўнікальны характар этнакультурнага суседства розных народаў.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь у міры і згодзе пражываюць прадстаўнікі больш як 140 нацый і народнасцяў. Яны захоўваюць і развіваюць сваю гісторыю, культурную спадчыну, узбагачаючы тым самым беларускае грамадства. У той жа час дзяржава паслядоўна праводзіць у жыццё прынцыпы нацыянальнай палітыкі, накіраванай на павагу і захаванне правоў і інтарэсаў усіх нацыянальных супольнасцяў.

Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур садзейнічае ўмацаванню традыцый дружбы і духоўнай блізкасці, якія аб'ядноўваюць шматнацыянальны народ Беларусі.

Упэўнены, што дзясяты, юбілейны фестываль будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню культурных і міжэтнічных сувязяў, з'яўленню новых яркіх творчых калектываў і выканаўцаў, стане маляўнічай падзеяй у чарадзе мерапрыемстваў горада Гродна — культурнай сталіцы Беларусі 2014 года.

Ад усёй душы жадаю фестывалю поспехаў і працвітання, а яго ўдзельнікам — творчага натхнення, здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# ЭКАНАМІЧНАЯ АСНОВА ІНТЭГРАЦЫІ

### Супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расіі — адзін з асноўных складнікаў у адносінах паміж дзвюма краінамі

**Першы форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі «Эфектыўнае развіццё аграпрамысловых комплексаў Беларусі і Расіі — важнейшая ўмова харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы» пачаў учора работу ў Мінску. Прывітанні на адрас удзельнікаў мерапрыемства накіравалі прэзідэнты дзвюх краін, паведамляе БЕЛТА. Для ўдзелу ў форуме прыбылі больш за 200 прадстаўнікоў з 19 рэгіёнаў Расіі на чале са старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянцінай Мацвіенка.**

Беларусь ужо даўно расцэньвае супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расіі як адзін з асноўных складнікаў беларуска-расійскіх адносін і рэальную эканамічную аснову інтэграцыі, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Валянцінай Мацвіенка і кіраўнікамі расійскіх рэгіёнаў, якія ўдзельнічаюць у форуме.

Першы форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі прысвечаны пытанням эфектыўнага развіцця аграпрамысловых комплексаў дзвюх краін. На думку Аляксандра Лукашэнкі, супрацоўніцтва ў гэтай галіне мае найважнейшае значэнне, бо ад яго рэалізацыі залежыць харчовая бяспека Саюзнай дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь выпускае шырокі спектр тэхнікі для сельскай гаспадаркі. Наколькі шырокі яе мадэльны рад, расійскія госці могуць пераканацца падчас наведвання аграпрамысловай выставы «Белагра». «На вашым рынку яна вядомая і папулярная. Нярэдка гэта сумесныя кааперацыйныя прадукты, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — У некаторых з іх доля расійскіх камплектуючых дасягае 80%».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Расіі больш за тысячу арганізацый з беларускім капіталам. У 2013 годзе на тэрыторыі Расіі працавалі 58 сумесных вытворчасцяў беларускай тэхнікі, якія паставілі на расійскі рынак прадукцыі амаль на $350 млн. Прычым асноўная ўдзельная вага (звыш 80%) тэхнікі, якая збіраецца, прыпадае на прадукцыю сельгасмашынабудавання — «Гомсельмаша», МТЗ, «Бабруйскаграмаша», «Лідаграпраммаша». Прэзідэнт лічыць, што пры зацікаўленасці расійскага боку і арганізацыйнай падтрымцы на месцах можна прапрацаваць пытанне арганізацыі дадатковых зборак беларускай сельгастэхнікі ў расійскіх рэгіёнах. У ліку перспектыўных напрамкаў беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў АПК Аляксандр Лукашэнка назваў жывёлагадоўлю, насенняводства, рыбную гаспадарку. Прэзідэнт лічыць рэальнай перспектыву працягу і пашырэння льготных праграм крэдытавання паставак беларускай тэхнікі на расійскі рынак. Рэалізацыя толькі адной такой праграмы са Сбербанкам Расіі дазволіла афарміць крэдытных дагавораў на суму каля $1,5 млрд. Такая ж праца пачалася з банкам ВТБ.

Прыкладам паспяховай інтэграцыі можа служыць і пачатак маштабнага супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расіі ў галіне будаўніцтва — беларускія будаўнічыя арганізацыі працуюць у Калузе, Курску, у Смаленскай і Маскоўскай абласцях. «Мы зацікаўлены ў падобных праектах і ў іншых гарадах Расіі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што падчас форуму расійскія госці маюць магчымасць абмеркаваць з беларускімі калегамі шырокае кола пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння. Ён выказаў упэўненасць, што правядзенне падобных сустрэч стане яшчэ адной добрай традыцыяй. Прэзідэнт Беларусі выказаў удзячнасць кіраўніцтву Савета Федэрацыі і асабіста Валянціне Мацвіенка за актыўны ўдзел і падтрымку ў арганізацыі і правядзенні ў Мінску такога маштабнага мерапрыемства.

# І ПРЫРОДА СКАЖА «ДЗЯКУЙ!»



**У Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя жыхароў Беларусі, Расіі і Казахстана аб'яднала маштабная экалагічная акцыя «Саюзная прыборка».**

У беларускай сталіцы актыўны ўдзел у ёй прынялі супрацоўнікі Мінпрыроды, Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і прадстаўнікі пасольстваў Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Сумесны «дзень чысціні» яны правялі на тэрыторыі Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі: наводзілі парадак у адным з дэндрарыяў парку, ачышчалі яго ад засохлых галін, пустазелля і лішніх парасткаў, каб вызваліць жыццёвую прастору для мясцовых жыхароў — экзотаў з Заходняй і Цэнтральнай Азіі.

Нягледзячы на пахмурнае надвор'е, настрой у кожнага ўдзельніка гэтага мерапрыемства быў узнёслым. І ўсё таму, што мэта, дзеля якой аб'ядналіся прадстаўнікі братэрскіх народаў, была самай высакароднай — унесці свой уклад у захаванне прыродных багаццяў Беларусі, Расіі і Казахстана.

— Мне вельмі прыемна ўдзельнічаць у гэтай важнай і цікавай справе, тым больш працаваць у адным з самых прыгожых куткоў Мінска, — падзялілася ўражаннямі аташэ Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Марыя Данец. — Падобныя акцыі кансалідуюць грамадства і, спадзяюся, яны змогуць прыцягнуць да экалагічных праблем увагу многіх людзей.



Саветнік Пасольства Рэспублікі Казахстан Амірзак БЕЙСПЕКАЎ працуе на абрэзцы дрэў.



Супрацоўніца Пасольства Расійскай Федэрацыі Вольга ДАВЫДАВА.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як расказаў намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Ігар Качаноўскі, сваё прафесійнае свята супрацоўнікі міністэрства заўсёды адзначаюць актыўнай працай на карысць прыроды. Добрай традыцыяй для беларускіх эколагаў стала навядзенне парадку ў Цэнтральным батанічным садзе і іншых важных для краіны аб'ектах.

Сёлета гэту ініцыятыву падтрымалі і прыродаахоўныя ведамствы Расіі і Казахстана. 5 чэрвеня ў трох краінах — членах Мытнага саюза прадстаўнікі розных міністэрстваў, прадпрыемстваў, грамадскіх арганізацый займаліся добраўпарадкаваннем прамысловых зон, тэрыторый устаноў адукацыі і культуры, а таксама лясоў, паркаў, сквераў, берагоў вадаёмаў і іншых месцаў адпачынку насельніцтва саюзных дзяржаў.

Дарэчы, як паведаміў саветнік Пасольства Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Амірзак Бейспекаў, на чарговым пасяджэнні Савета ў галіне аховы навакольнага асяроддзя пры інтэграцыйным камітэце ЕАЭС кіраўнікі прыродаахоўных ведамстваў Беларусі, Расіі і Казахстана дамовіліся кожны год праводзіць сумесны «Дзень чысціні». А гэта значыць, што сотні грамадзян, неабыякавых да праблем экалогіі, яшчэ не раз аб'яднаюцца для здзяйснення сваіх добрых спраў.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:**

***«У ліку найважнейшых прыярытэтаў знешнеэканамічнай стратэгіі Беларусі — выхад на новыя рынкі, стварэнне сумесных прадпрыемстваў з партнёрамі для ўзаемавыгаднага абмену тэхналогіямі і ноу-хау. Дынамічныя тэмпы росту экспарту з'яўляюцца найлепшым паказчыкам канкурэнтаздольнасці кампаній. Няпростая сітуацыя на знешніх рынках не спрыяе хуткаму росту экспарту, але, працуючы з унутранымі рэзервамі, павышаючы якасць прадукцыі, укараняючы лепшыя сусветныя практыкі ў кіраванне, можна і неабходна перамагаць у канкурэнтнай барацьбе і выходзіць на мэтавыя рубяжы».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10120,00 | ▲ |
| Еўра | 13770,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 290,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 853,29 | ▼ |

# ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

### Новым выклікам і пагрозам можна супрацьдзейнічаць толькі шляхам кансалідацыі сіл і магчымасцяў

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з кіраўнікамі дэлегацый, якія прыехалі ў Мінск для ўдзелу ў 36-м пасяджэнні Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем адзначыў скарачэнне ўдзельнікаў сустрэчы, кіраўнікоў спецслужбаў СНД, што абумоўлена выхадам Грузіі з Садружнасці. Пра падобныя намеры заяўляе таксама Украіна.

«Тым не менш новыя выклікі і пагрозы настойліва патрабуюць каардынацыі нашых агульных намаганняў і максімальнага выкарыстання інтэграцыйных магчымасцяў Садружнасці для ўмацавання бяспекі краін-удзельніц», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Сёння нас спрабуюць раз'яднаць, нацкоўваючы адзін на аднаго, выкарыстоўваючы любыя нагоды, уключаючы скажэнне гісторыі. Мэта зразумелая — трэба выкараніць агульную памяць пра тое, хто перамог у Вялікай Айчыннай вайне, хто вызваліў Еўропу ад фашызму, стварыць умовы для новага перадзелу свету, зацвердзіўшы сваё панаванне ў розных частках планеты», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, апошнім часам традыцыйныя міжнародныя інстытуты забеспячэння бяспекі, на жаль, не заўсёды здольныя эфектыўна супрацьстаяць глабальным выклікам. Прычым гэтыя пагрозы не могуць быць нейтралізаваны на ўзроўні асобных дзяржаў, супрацьдзейнічаць ім магчыма толькі шляхам кансалідацыі намаганняў. І асаблівая роля ў гэтым працэсе адведзена спецслужбам, іх уменню аналізаваць і прагназаваць развіццё становішча, якое складваецца.

«Нам не варта звонку чакаць эфектыўных рэцэптаў супрацьдзеяння выклікам і пагрозам рэгіянальнай бяспецы. Мы адказныя за стабільнасць на нашых землях і павінны фарміраваць сумесныя механізмы рэагавання на дэстабілізуючыя фактары», — падкрэсліў беларускі лідар. Прэзідэнт адзначыў, што беларускі бок гатовы падзяліцца сваім вопытам забеспячэння бяспекі маштабных мерапрыемстваў.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што глабальная нестабільнасць абумоўлівае неабходнасць нарошчвання сумесных намаганняў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам, экстрэмізмам, транснацыянальнымі дэструктыўнымі фарміраваннямі, злачынствамі ў галіне высокіх тэхналогій. Прэзідэнт таксама заклікаў звярнуць пільную ўвагу на пытанні барацьбы з карупцыяй: «Мы бачым, да якіх разбуральных наступстваў можа прывесці татальная карупцыя, узведзеная ў ранг дзяржаўнай палітыкі, на прыкладзе, у тым ліку, нашых бліжэйшых суседзяў».

■ По сутнасці справы

# ВЫЙСЦЕ З «КРЭДЫТНАЙ БАГНЫ»

### шукалі карэспандэнты «Звязды»



**Спецыфічнасць рынкавых адносін у тым, што на любое «хачу» амаль заўсёды знойдзецца чыёсьці «калі ласка». Нічога, зразумела, дрэннага тут няма — звычайны баланс попыту і прапановы. Аднак паміж першым і другім абавязкова фігуруе «пасрэднік» — грошы. І менавіта іх — выключна абмежаваная колькасць. Ад аднаго толькі «хачу» грошай больш не стане. Груба кажучы, яны падзяляюцца на дзве групы: свае, зробленыя, і чужыя, якія ходзяць недзе побач, але вам не належаць. Галоўнае, у іх не заблытацца...**

СТАР. 6

■ Прыемная навіна

# ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР — НА ПАШТОВАЙ МАРЦЫ

**5 чэрвеня, напярэдадні адкрыцця заключных мерапрыемстваў X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, у горадзе над Нёманам была выпушчана ў абарачэнне паштовая марка накладам 72 тысячы экзэмпляраў, прысвечаная Гродзенскаму абласному драматычнаму тэатру.**

**Для даведкі:** *у 2013 годзе ў серыі «Тэатры Беларусі» былі выпушчаны дзве паштовыя маркі: «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь», «Беларускі дзяржаўны тэатр лялек». Сёлета гэтая серыя працягнута маркай «Гродзенскі абласны драматычны тэатр. «Наш гарадок».*

Канверт з арыгінальнай маркай «Гродна — культурная сталіца Беларусі 2014 г.» быў выпушчаны па ініцыятыве Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і Гродзенскага філіяла «Белпошты». Мастацкай асновай маркі стала эмблема абласнога драматычнага тэатра як асноўнага культурнага цэнтра рэгіёна. Афіцыйнае гашэнне паштовай маркі і канверта першага дня адбылося ў будынку «віноўніка» ўрачыстасці — тэатра — з удзелам начальніка галоўнага ўпраўлення па ідэалагічнай рабоце, культуры і справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Паўла Скрабко, дырэктара Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Івана Пратасевіча і заслужанай артысткі Беларусі Людмілы Волкавай. На працягу дня паслугай памятнага гашэння маглі скарыстацца ўсе ахвотныя жыхары і госці горада.



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ПОЛЬШЧЫ СУТЫКНУЛІСЯ ДВА АЎТОБУСЫ: ЗАГІНУЛІ 7 ЧАЛАВЕК



У выніку сутыкнення двух аўтобусаў на паўднёвым захадзе Польшчы загінулі 7 чалавек, паведамляе мясцовая паліцыя. Інцыдэнт адбыўся на аўтастрадзе A4, якая злучае гарады Аполе і Крапковіцэ. «Аўтобус з украінскімі рэгістрацыйнымі нумарамі ўрэзаўся ў аўтобус з абслуговым персаналам трасы. Паводле папярэдніх звестак, загінулі 7 чалавек», — заявіў прадстаўнік польскай паліцыі. На месцы здарэння была праведзена выратавальная аперацыя з удзелам медыцынскіх верталётаў. Прычыны і абставіны аварыі пакуль невядомыя.

### БАШАР АСАД ПЕРААБРАНЫ ПРЭЗІДЭНТАМ

Башар Асад перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Сірыі, набраўшы 88,7% галасоў, перадаюць інфармагенцтвы. Яўка на выбарах была настолькі высокая, што галасаванне падоўжылі на пяць гадзін. У выніку на ўчасткі прыйшло 73,42 % выбаршчыкаў ад іх агульнай колькасці. Цяперашнія прэзідэнцкія выбары — першыя ў гісторыі Сірыі, якія прайшлі на альтэрнатыўнай аснове. Акрамя Башара Асада, у выбарчай кампаніі ўдзельнічалі яшчэ два кандыдаты — дэпутат-камуніст з Алепа Махер Абдэль Хафіз Хаджар, які набраў у выніку 3,2 % галасоў, і ліберал Хасан Абдэль Ілляхі ан-Нуры, за якога прагаласавалі 4,3 % выбаршчыкаў. Башар Асад абраны кіраўніком дзяржавы на трэці тэрмін.

### КАЗАХСТАН ПАЧНЕ БУДАВАЦЬ АЭС У 2018-м

Будаўніцтва першай у Казахстане АЭС пры ўдзеле Расіі можа пачацца ў 2018 годзе, паведаміла агенцтва «Сіньхуа» са спасылкай на намесніка міністра індустрыі і новых тэхналогій Казахстана Бахытжана Джаксаліева. Напрыканцы мая Расія і Казахстан заключылі шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве, у тым ліку аб узвядзенні першай у Казахстане атамнай станцыі. Праект прадугледжвае будаўніцтва энергаблокаў з рэактарамі тыпу ВВЭР магутнасцю ад 300 МВт да 1200 МВт. Акрамя таго, краіны будуць супрацоўнічаць у пытаннях забеспячэння АЭС ядзерным палівам з магчымасцю яго вытворчасці на тэрыторыі Казахстана.

ISSN 1990 - 763X

14104

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЧАМУ ЛЕТАМ АБАВЯЗКОВА ТРЭБА ЕСЦІ КАВУНЫ?



Па-першае, кавун дапамагае схуднець, піша Zee News. У ім, як вядома, змяшчаецца амінакіслата цытрулін. Ныркамі яна ператвараецца ў аргінін. А гэтае злучэнне перашкаджае назапашванню тлушчу ў тлушчавых клетках. Яшчэ цытрулін блакіруе актыўнасць неспецыфічнай шчолачнай фасфатазы, у выніку тлушчавыя клеткі выпрацоўваюць менш тлушчу. Цытрулін паскарае дастаўку лейкацытаў у месцы пашкоджанняў скуры. Такім чынам, працэс фарміравання новых тканак і зацягвання ран працякае хутчэй. Кавун з'яўляецца таксама крыніцай вітаміна А, які дапамагае выпрацоўваць пігмент у сятчатцы. Ён абараняе ад узроставай макулярнай дэгенерацыі і курынай слепаты. Вітамін А падтрымлівае маладосць скуры, зубоў, шкілета, мяккіх тканак, слізістых абалонак. Яшчэ арганічныя пігменты з кавуна паляпшаюць працу сардэчнай сістэмы. У прыватнасці, кавун не дае павышацца халестэрыну. Кавуны добра зніжаюць тэмпературу цела і паказчыкі крывянога ціску.

■ Надвор'е

# Цёпла і сонечна будзе ў выхадныя

**паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.**

Сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі ў асноўным будзе вызначаць маларухомы атмасферны фронт, па ўсходзе краіны адчуецца ўплыў вельмі цёплай паветранай масы. У сувязі з гэтым ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература паветра днём будзе ад 23 да 29 градусаў цяпла, на ўсходзе паветра прагрэецца да 30-31 цяпла.

У суботу ноччу на большай частцы тэрыторыі Беларусі, днём ва ўсходніх раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Месцамі пройдуць моцныя дажджы, прагрымяць навальніцы, днём па ўсходзе магчымы град. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 10-16 градусаў, днём — ад 21 да 28 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе будзе яшчэ на пару градусаў цяплей. У нядзелю, 8 чэрвеня, франтальны раздзел пакіне Беларусь.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «БО ГАЗЕТУ ЦІКАВА ЧЫТАЦЬ І ПРАЗ МЕСЯЦ»

**Раман ДАПІРА, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі:**

«Звязду» чытаю яшчэ са школьных гадоў, калі выбіраў для сябе аўтарытэтныя беларускамоўныя выданні. З таго часу яна стала для мяне заўсёдным спадарожнікам. Звычайна чытаю газеты ў дарозе, таму «Звязда» са мною ў любой камандзіроўцы. Сёння даволі мала газет, якія цікава чытаць праз тыдзень ці месяц пасля іх выхаду ў свет. Са «Звяздой» сітуацыя іншая. Яе матэрыялы, асабліва аналітычныя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя, культуралагічныя, з часам становяцца яшчэ больш каштоўнымі.

Цяпер менавіта па «Звяздзе» звяраю шляхі развіцця айчыннай адукацыі і навукі. Больш інфармаванага ў гэтым кірунку выдання ў айчыннай інфармацыйнай прасторы проста няма. Заўсёды дакладна, аб'ектыўна і аўтарытэтна. «Звязда» даволі часта звяртаецца да прафсаюзнай тэматыкі, якая падаецца граматна і прафесійна.



Вельмі цікава распавядае выданне пра айчынныя прадпрыемствы. Журналістам удаецца ўзняцца над рамкамі жанру рэкламных матэрыялаў і распавесці пра надзённыя турботы і заваёвы нашых вытворцаў. Здараецца, што менавіта на старонках «Звязды» даведваешся пра навінкі прадукцыі хутчэй, чым яны з'яўляюцца на паліцах нашых крам.

Публікацыі на гістарычную і краязнаўчую тэматыку заўсёды дадаюць нешта новае да ўжо вядомага, таму менавіта яны становяцца добрым дадаткам да гістарычных выданняў.

«Чырвонка» радуе юначымі галасамі будучых журналістаў, навінамі з устаноў адукацыі, нетрывіяльным падыходам да маладзёжных праблем. Сацыяльная скіраванасць маладзёжнага дадатку надае аўтарытэт выданню сярод лідараў маладзёжных арганізацый, у тым ліку і прафсаюзных.

Прыемна бачыць на старонках «Звязды» матэрыялы пра навінкі беларускага кнігавыдання, у тым ліку і Выдавецкага дома «Звязда». Гэта асабліва важна для чытачоў з тых рэгіёнаў, дзе наш кнігагандаль прадстаўлены надзвычай сціпла. Для многіх чытачоў звяздоўскі «Экслібрыс» — фактычна адзіны кніжны навігатар.

Зычу «Звяздзе» ўдзячных чытачоў, асабліва сярод моладзі, якой вельмі не хапае актуальнага і карыснага чытва.

**Запісала Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Форум

# РЭГІЁНАМ ДАМАЎЛЯЦЦА ПРАСЦЕЙ

**На першым форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі «Эфектыўнае развіццё аграпрамысловых комплексаў Беларусі і Расіі — найважнейшая ўмова харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы» абмяркоўваюцца надзённыя для жыхароў абедзвюх краін пытанні.**

## Знайсці нявыкарыстаныя рэзервы

На ўрачыстым адкрыцці **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль РУБІНАЎ** заўважыў, што форум можна лічыць новым інструментам узаемадзеяння паміж рэгіёнамі дзвюх краін.

— Цеснае супрацоўніцтва нашых краін абумоўлена не толькі геаграфічным, геапалітычным, гістарычным фактарам, але і ўзаемапранікненнем эканомік, — нагадаў спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Расійская Федэрацыя з'яўляецца асноўным гандлёвым партнёрам Рэспублікі Беларусь. Па выніках мінулага года ўзаемны тавараразварот Беларусі і Расіі склаў амаль 40 мільярдаў долараў. Сумесныя напрацоўкі па рэалізацыі дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы сталі асновай для фарміравання Мытнага саюза і дазволілі выйсці тром дзяржавам на якасна новы ўзровень інтэграцыі ў эканамічнай сферы.

Паводле выступлення Анатоля Рубінава, міжрэгіянальнае супрацоўніцтва з'яўляецца базай для эканамічнага ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі. Наша дзяржава падтрымлівае сувязі амаль з усімі рэгіёнамі суседняй дзяржавы. Больш за 8 тысяч беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў здзяйсняюць узаемныя пастаўкі сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў. 66 рэгіёнаў Расіі звязаны з нашай краінай дамоўленасцю аб супрацоўніцтве. Паміж абласцямі нашай дзяржавы, горадам Мінска і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі, беларускімі раённымі і расійскімі муніцыпальнымі ўтварэннямі заключана прыкладна 300 рознага кшталту пагадненняў.

— Для актывізацыі гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння паміж урадам Рэспублікі Беларусь і адміністрацыяй рэгіёнаў Расіі дзейнічае больш за 40 камісій, саветаў, працоўных груп па супрацоўніцтве, — падкрэсліў кіраўнік Савета Рэспублікі. — Найбольш актыўныя гандлёва-эканамічныя стасункі склаліся ў Беларусі з Масквой, Санкт-Пецярбургам, Рэспублікай Татарстан, Маскоўскай, Цюменскай, Смаленскай, Арэнбургскай, Ленінградскай абласцямі.

— Тым не менш, нягледзячы на ўзаемную зацікаўленасць у развіцці двухбаковых кантактаў, у стасунках паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі яшчэ маюцца значныя не выкарыстаныя рэзервы, — лічыць спікер Савета Рэспублікі. — І сёння падчас форуму ў нас ёсць магчымасць абмеркаваць усе існуючыя праблемы і знайсці шляхі іх вырашэння.

## На парадку дня — незалежнасць ад ГМА

У сваю чаргу **Валянціна МАЦВІЕНКА, старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі,** у сваім выступленні звярнула ўвагу на тое, што супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў аграпрамысловым сектары мае значныя вынікі.

— Летась, калі параўноўваць з 2012 годам, экспарт харчовай прадукцыі з Беларусі ў Расію павялічыўся ў 1,5 раза, — паведаміла яна. — А з Расіі ў Беларусь — у 1,3 раза.

Старшыня расійскага сената лічыць, што сёння праблема харчовай бяспекі набывае новую актуальнасць на фоне агрэсіўнага распаўсюджвання ў свеце генетычна мадыфікаваных арганізмаў — ГМА. Вядома, што гаспадаркі, якія перайшлі на вырошчванне трансгенных культур, трапляюць у поўную залежнасць ад вытворцаў насення, бо не могуць самастойна ажыццяўляць яго рэпрадукцыю. Не вывучаны наступствы ўплыву генетычна мадыфікаванай прадукцыі на здароўе людзей.

— У такіх умовах нам неабходна стварыць жорсткую сістэму кантролю за абарачэннем ГМА, увозам такой прадукцыі на тэрыторыю Саюзнай дзяржавы, а таксама забараніць увоз генетычна мадыфікаванага насення, — упэўнена Валянціна Мацвіенка.

Расійскі сенатар лічыць мэтазгодным прапанаваць ведамствам Беларусі і Расіі — міністэрствам сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, замежных спраў — падрыхтаваць і ўнесці на абмеркаванне ў Генеральную Асамблею ААН праект рэзалюцыі аб стварэнні сумеснай з FAO (Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыяй ААН) і Сусветнай арганізацыяй па ахове здароўя рабочай групы экспертаў. Мэта гэтай камісіі — выпрацоўка рэкамендацый па выкарыстанні новых генетычна мадыфікаваных крыніц харчавання, а таксама дэталёвае вывучэнне наступстваў іх уплыву на здароўе людзей.

## База для сумесных прадпрыемстваў

**Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы,** заўважыў, што форум можна назваць адным са звёнаў у сістэме стасункаў паміж краінамі. У дадзеным выпадку — у галіне аграпрамысловага комплексу.

— Якая б праца ні праводзілася, заўсёды ёсць патрэба ўсім сабрацца, абмяняцца думкамі, вызначыцца з планамі на будучыню. Менавіта гэтага і трэба чакаць ад форуму.

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы заўважыў, што за апошнія 10 гадоў супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі значна пашырылася.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Парламенцкі дзённік

# МЕРЫ СУПРАЦЬ ФІНАНСАВАННЯ ЗЛА

**На ўчарашнім пасяджэнні чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты разгледзелі 13 законапраектаў, сярод якіх адзін датычыўся мер па папярэджанні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і распаўсюджвання зброі масавага паражэння. Гэты дакумент паступіў у парламент у рэжыме «тэрмінова» і быў прыняты адразу ў двух чытаннях.**

## Барацьба з тэрарызмам

— З 2000 года ў нашай краіне функцыянуе нацыянальная сістэма супрацьдзеяння легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму, — нагадаў дэпутатам **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЯКАБСОН.** — Яна ўключае праваахоўныя і іншыя дзяржаўныя органы, банкаўскую сферу і іншыя арганізацыі, якія ажыццяўляюць фінансавыя аперацыі. Цэнтральным элементам гэтай сістэмы з'яўляецца Дэпартамент фінансавага маніторынгу Камітэта дзяржаўнага кантролю. У 2013 годзе з выкарыстаннем інфармацыі дэпартамента было выяўлена 420 злачынстваў, за чатыры месяцы 2014 года — 133 злачынствы.

Усе элементы нацыянальнай сістэмы супрацьдзеяння легалізацыі злачынных даходаў працуюць як адзіны механізм, запэўніў кіраўнік кантрольнага ведамства. У снежні 2008 года нацыянальная сістэма была ацэнена на адпаведнасць міжнародным стандартам у гэтай сферы, якія вызначыла міжурадавая арганізацыя па барацьбе з адмываннем грошай FATF.

Міжнародныя эксперты адзначылі высокі ўзровень выканання Беларуссю сусветных стандартаў у гэтай сферы, разам з тым яны выказалі шэраг заўваг і рэкамендацый для ліквідацыі недахопаў. Законапраект, які ўчора разглядалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, мае за мэты ліквідаваць заўвагі 2008 года, а таксама дапоўніць заканадаўства Беларусі згодна з новымі стандартамі 2012 года. Акрамя таго, асобныя элементы нацыянальнай сістэмы супрацьдзеяння легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму ўдасканальваюцца з улікам практыкі прымянення дзейнага заканадаўства.

Асноўнае новаўвядзенне законапраекта ў тым, што банкі ў Беларусі змогуць прыпыняць здзелкі, адмаўляць у іх ці разрываць адносіны з сумніўнымі кліентамі пры ажыццяўленні фінансавых аперацый. Напрыклад, банкам будзе дадзена права на двое сутак прыпыніць здзелку — за гэты час фізічная ці юрыдычная асоба будзе праверана. Калі здзелка з'яўляецца легальнай, фінансавая аперацыя працягнецца ў штатным рэжыме.

Права разрываць адносіны з сумніўнымі кліентамі будзе дадзена ўсім банкам (дзяржаўным і прыватным) і пазабанкаўскім арганізацыям, якія праводзяць фінансавыя аперацыі як з юрыдычнымі, так і з фізічнымі асобамі. Пад пазабанкаўскімі арганізацыямі маюцца на ўвазе таварныя біржы, ламбарды, пункты скупкі золата і г.д. Іх працу будуць кантраляваць Міністэрства фінансаў, КДБ, МУС, Нацыянальны банк Беларусі і іншыя профільныя арганізацыі.

## Рынак каштоўных папер павінен быць зразумелым

У першым чытанні парламентарыі разгледзелі праект закона «Аб рынку каштоўных папер».

— Папярэдні закон быў прыняты ў 1992 годзе, з таго часу істотна змяніліся ўмовы на фінансавым рынку, мы набылі вопыт і хутка будзем працаваць у вельмі цеснай інтэграцыі з Расіяй і Казахстанам, таму ўзнікла патрэба заканадаўчых змен, — сказаў журналістам **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Валерый БАРАДЗЕНЯ.** — Спадзяюся, што асноўнай зменай стане тое, што дзяржава частку функцый па ўрэгуляванні рынку аддасць самарэгуляваным арганізацыям прафесіяналаў, стварэнне якіх прадугледжана праектам закона. Такія арганізацыі таксама змогуць больш выказваць ініцыятыў па кірунках развіцця рынку каштоўных папер.

## Пагадненне аб нафтапошлінах

Сярод міжнародных дакументаў дэпутаты ратыфікавалі міжурадавы пратакол паміж Беларуссю і Расіяй аб працягу дзеяння Пагаднення аб парадку платы і залічэння вывазных мытных пошлін пры вывазе з тэрыторыі Беларусі за межы Мытнага саюза нафты сырой і асобных катэгорый тавараў, якія з яе выпрацаваны, ад 9 снежня 2010 года.

— У выніку гэтага пагаднення мы вырашылі стратэгічную задачу — цалкам загрузілі нашы нафтаперапрацоўчыя заводы сыравінай, — пракаментаваў журналістам законапраект **Віталь БУСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах.** — Да таго ж частка пошлін, згодна з пагадненнем, застаецца ў Беларусі. Напрыклад, у 2013 годзе мы пералічылі ў бюджэт Расіі каля $3,3 млрд і ва ўласны бюджэт — $633 млн, у суадносінах 81% да 19%. Нарэшце, уся беларуская нафта, як у сырым выглядзе, так і ў выглядзе нафтапрадуктаў, можа прадавацца з адлічэннем усіх пошлін у дзяржаўны бюджэт нашай краіны.

Дзеянне пагаднення прадоўжана да 31 снежня 2014 года. З падпісаннем дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза паміж Расійскай Федэрацыяй і Беларуссю будуць падпісаны дадатковыя пагадненні па змяненні сістэмы гэтых плацяжоў.

У сваю чаргу **намеснік міністра фінансаў Беларусі Дзмітрый КІЙКО** нагадаў журналістам, што ў Астане 29 мая былі дасягнуты дамоўленасці пра тое, што Беларусь з 2015 года будзе атрымліваць у свой бюджэт $1,5 млрд ад вывазных пошлін на нафту і нафтапрадукты, а ўсё, што вышэй гэтага аб'ёму, пералічваць у бюджэт Расіі.

«Зыходзячы з тых сум, якія ў нас складаюцца штогод, а гэта $3,5 млрд, можна зрабіць прагноз, што ў расійскі бюджэт будзе пералічана каля $2 млрд. Гэта значыць, прыблізна размеркаванне паміж бюджэтамі складзе 40% да 60%», — сказаў намеснік міністра.

Умовы 2015 года будуць найлепшымі за апошнія 7 гадоў па такім адчувальным пытанні паміж Беларуссю і Расіяй, падкрэсліў Дзмітрый Кійко. Ён дадаў, што дамоўленасці па пошлінах не ўвязаны з аб'ёмамі паставак на расійскі рынак нафтапрадуктаў з Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Знешнепалітычны вектар

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ІДЗЕ, АЛЕ ПЫТАННІ ЗАСТАЮЦЦА

Фота БЕЛТА.



**МЗС Беларусі вядзе з дзярждэпартаментам ЗША работу, накіраваную на нармалізацыю беларуска-амерыканскіх стасункаў. Пра гэта заявіў, каментуючы нядаўнюю сустрэчу Уладзіміра Макея, кіраўніка знешнепалітычнага ведамства нашай краіны, з прадстаўніком дзяржсакратара ЗША Эрыкам Рубіным, на чарговым брыфінгу прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

Ён заўважыў, што Уладзімір Макей ужо не першы раз сустракаецца з намеснікам памочніка дзяржаўнага сакратара Злучаных Штатаў спадаром Эрыкам Рубіным. «Адбыўся шэраг кансультацый паміж міністэрствамі замежных спраў абедзвюх краін па двухбаковых пытаннях, а таксама па супрацоўніцтве ў міжнародных арганізацыях, — паведаміў прэс-сакратар. — Беларусь і ЗША супрацоўнічаюць у галінах узаемнага інтарэсу і па пытаннях забеспячэння глабальнай і рэгіянальнай бяспекі».

Дзмітрый Мірончык праінфармаваў, што з 2004 года Беларусь дазваляе выкарыстоўваць сваю паветраную прастору і здзяйсняць пасадкі на беларускіх аэрадромах пры пералётах амерыканскіх самалётаў у Афганістан. Са студзеня 2011 года праз нашу тэрыторыю ажыццяўляецца чыгуначны транзіт грузаў для ЗША ў Афганістане. У мінулым 2013 годзе дадзеная дамоўленасць была пацверджана і пашырана.

Прадстаўнік дыпламатычнага ведамства адзначыў, што Злучаныя Штаты падтрымалі ініцыятыву Беларусі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па барацьбе з гандлем людзьмі, па прадухіленні незаконнага гандлю чалавечымі органамі. Паміж нашымі краінамі рэалізуецца шэраг узаемавыгадных праектаў у галіне інвестыцый, гандлю. Таксама Беларусь і ЗША супрацоўнічаюць па пытаннях прадухілення незаконнага транзіту ядзерных матэрыялаў. «Узаемадзеянне праваахоўных органаў дзвюх краін садзейнічае раскрыццю канкрэтных міжнародных злачынстваў, якія наносілі шкоду асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян Беларусі, Злучаных Штатаў і іншых дзяржаў», — заявіў прадстаўнік МЗС.

У той жа час у беларуска-амерыканскіх стасунках ёсць складаныя пытанні, па якіх бакі заяўляюць адзін аднаму свае прынцыповыя пазіцыі. «Беларускі бок паслядоўна і настойліва выступае супраць прымянення Злучанымі Штатамі аднабаковых эканамічных санкцый, — падкрэсліў Дзмітрый Міронччык. — Мы ўпэўнены ў неабходнасці адмены дзеяння санкцый у дачыненні да шэрагу беларускіх прадпрыемстваў. Сукупнасць фактараў, якая ўключае ўнутрыпалітычныя меркаванні і інерцыю знешняй палітыкі ЗША, ускладняе магчымасць хуткай адмены ўсіх санкцый. На парадку дня беларуска-амерыканскіх стасункаў гэтае пытанне застаецца прыярытэтным».

Напрыканцы прэс-сакратар МЗС адзначыў, што эканамічныя санкцыі наносяць шкоду інтарэсам амерыканскіх кампаній, зацікаўленых у выгадным дзелавым супрацоўніцтве з беларускімі прадпрыемствамі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НА АБАРОНЕ БЕЛАГА АМУРА

**Белы амур — рэдкі госць у нашых вадаёмах. Таму, заўважыўшы малька гэтай рыбы ў возеры каля вёскі Дзягільна Дзяржынскага раёна, мясцовыя рыбакі ўзрадаваліся. Аднак неўзабаве заўважылі, што нядобрасумленныя рыбаловы (пераважна прыезджыя) ловяць амура, які не дасягнуў прамысловай меры — 40 сантыметраў. Хаця вырасці гэтая рыба можа да метра.**

— Група актывістаў звярнулася ў Стаўбцоўскую міжрайінспекцыю і Дзяржынскі райвыканкам. Мясцовая ўлада пастанавіла: забараніць лоўлю белага амура на возеры да 31 жніўня гэтага года. А нашы дзяржінспектары сталі часцей наведвацца на вадаём, — распавяла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.** — Аднойчы затрымалі на возеры адразу чатырох парушальнікаў, якія рыбачылі падчас забароны. Усе яны аказаліся з Мінска. Двое з іх паспелі здабыць амураў, якія не дасягнулі прамысловай меры. Пра тое, што парушаюць закон, ведалі, але паставіліся да гэтага несур'ёзна. На ўсіх затрыманых дзяржінспектары склалі адміністрацыйныя пратаколы. Акрамя пакрыцця шкоды (450 тысяч рублёў за кожную асобіну), іх чакае штраф да 50 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УЦЕКАЧОЎ ВЯРНУЛІ Ў ВУЧЫЛІШЧА

**Падлеткаў, якія раніцай 1 чэрвеня самавольна пакінулі Крывіцкае дзяржаўнае спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 3 закрытага тыпу, што ў Мядзельскім раёне, затрымалі ў Расіі. Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама.**

Вечарам 4 чэрвеня паблізу чыгуначнай станцыі гарадскога пасёлка Рудня Смаленскай вобласці затрыманы Аляксей Ніцманіс, Аляксандр Флярко, Давід Багданаў і Рыгор Дайко. Яшчэ траіх сяброў (Арцёма Кейзерава, Захара Васілеўскага і Дзмітрыя Кавалёва) затрымалі ў ноч з 4 на 5 чэрвеня на чыгуначным вакзале ў Смаленску.

Далей за ўсіх «дабег» Ігар Цалінскі, якога «ўзялі» ў месцы яго магчымага з'яўлення: у горадзе Люберцы Маскоўскай вобласці.

Чатырох уцекачоў ужо перадалі ў рукі супрацоўнікам вучылішча, астатнія ў бліжэйшы час будуць вернуты па месцы вучобы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## НАШ АРНОЛЬД



**На наступным тыдні тэлеканал «Беларусь 3» прадставіць шэраг праектаў, прысвечаных 75-годдзю народнага артыста Беларусі Арнольда Памазана.**

«Візітоўкай» вядомага акцёра, ролі якога не адно дзесяцігоддзе ўпрыгожваюць спектаклі Купалаўскага тэатра, стала знакамітая «Паўлінка». Каларытная роля жаніха-франта Адольфа Быкоўскага дасталася Памазану адразу пасля заканчэння тэатральнага інстытута і прырасла да свайго выканаўцы надоўга. У 1995 годзе, напрыклад, адбыўся своеасаблівы юбілей — тысячны выхад на сцэну ў вобразе Быкоўскага.

...Пра тое, як пачынаўся творчы шлях народнага артыста Беларусі і як наогул ураджэнец Камсамольска-на-Амуры трапіў у Беларусь, распавядзе праграма «Плошча мастацтваў» акурат да 75-годдзя акцёра — у суботу, 14 чэрвеня. У гэты ж дзень гледачы ўбачаць і тэлеспектакль «Калі мамы няма дома» паводле Ніла Саймана, дзе Арнольд Памазан выконвае галоўную ролю.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ВЫРАТАВАЛА ДЗЯЦЕЙ І СУЖЭНЦА

**Пра пажар у вёсцы Чарэшля Навагрудскага раёна выратавальнікам паведамілі пасля дзвюх гадзін ночы: мясцовы жыхар прачнуўся ад гучнага воплеску, выглянуў у акно — суседскі дом ужо гарэў адкрытым полымем...**

У ім пражывала сям'я, якая шэсць гадоў таму пераехала ў вёску са сталіцы. Мужчына 1975 года нараджэння працаваў вахтавым метадам, а жанчына 1981 года нараджэння гадавала маленькіх сыноў — 2010 і 2013 гадоў нараджэння.

Як потым высветлілася, каля поўначы гаспадыня падагрэла чайнік на газавай пліце, папіла гарбаты і пайшла спаць. Прачнулася ад таго, што са столі нешта сыпалася. Жанчына вынесла праз палаючую кухню на двор адно дзіця, вярнулася па другое, а потым па мужа. Мужчыну, які страціў прытомнасць, літаральна выцягвала з-пад столевых перакрыццяў, што ўжо абваліліся. Жанчына атрымала апёкі 10 працэнтаў цела, сужэнец і трохгадовы сын — 45 працэнтаў, немаўля — 40 працэнтаў...

Паводле інфармацыі Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, мяркуецца, што адбыўся выбух газапаветранай сумесі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВЫЦЯГНУЛІ ЧАЛАВЕКА З АГНЮ

**Пажар у доме жыхара вёскі Унучкі Камянецкага раёна здарыўся сярод белага дня. Суседзі заўважылі ўзгаранне, калі полымя стала відаць з акон, і выклікалі МНС.**

На шчасце гаспадара, відавочцам пажару аказаўся супрацоўнік Камянецкага райаддзела па надзвычайных сітуацыях капітан Сяргей Галубковіч, у якога быў выхадны дзень. Капітан унутранай службы і сусед пагарэльца Аляксандр Мартынюк выцягнулі небараку з агню.

**Яна СВЕТАВА.**

## У БРЭСЦЕ ЗНОЎ ПРАПАЛА ДЗЯЎЧЫНА

**Прайшоў усяго тыдзень, як у Брэсце шукалі Дар'ю Шайко, студэнтку Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта.**

Нагадаю, дзяўчына выйшла з інтэрната ўдзень, а знайшлі яе праз суткі ў Нясвіжы з поўнай стратай памяці. І вось новае паведамленне — чацвёрты дзень шукаюць 18-гадовую брастаўчанку Ксенію Волкаву. Дзяўчына выйшла з дому прыкладна а пятай раніцы, прыхапіўшы толькі ключы ад кватэры. Да гэтай пары пра яе знаходжанне нічога не вядома. Паводле звестак выпадковага сведкі, яе бачылі ў горадзе, яна ішла ў кірунку памежнага пераходу «Казловічы». У чацвер у першай палове дня ніякіх дадатковых звестак пра месцазнаходжанне Ксеніі не паступіла.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПАЖАР НА КАНЮШНІ

**Ён здарыўся ў аграсядзібе ў вёсцы Буцэвічы Мінскага раёна пасля трох гадзін ночы.**

Калі праз 15 хвілін пасля выкліку да будынка прыбылі выратавальнікі, канюшня ўжо гарэла адкрытым полымем. У будынку знаходзіліся 12 коней. Знаёмы гаспадара жывёл, 51-гадовы мужчына, вывеў з палаючай канюшні 10 коней. Два загінулі, агонь таксама знішчыў шыферны дах, пашкодзіў сцены драўлянага будынка 2009 года пабудовы. Сам выратавальнік атрымаў цяжкія апёкі першай-трэцяй ступені 20 працэнтаў цела. Прычына пажару ўстанаўліваецца. Пацярпелы знаходзіцца ў цяжкім стане.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗА СПАЙС — ДА 15 ГАДОЎ

**Па медыцынскую дапамогу са студзеня па май у выніку перадазіроўкі наркатычных сродкаў і псіхатропаў звярнуліся 372 чалавекі. Васьмёра загінулі. Большасць перадазіровак выклікана ўжываннем «спайсаў» і «міксаў».**

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, сёлета Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў папоўнілі 63 новыя рэчывы. За чатыры месяцы года заведзена амаль 2,5 тысячы крымінальных спраў, звязаных з незаконным абаротам наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. 28 мая за незаконны абарот «спайсаў» суд Фрунзенскага раёна сталіцы асудзіў сямёра чалавек. Трое з іх — да 11 і 12 гадоў пазбаўлення волі. У той жа дзень да пазбаўлення волі тэрмінам ад 11 да 13 гадоў у Брэсце асуджаны пяцёра членаў злачыннай групоўкі, якія арганізавалі пастаўку псіхатропаў з-за мяжы. Наогул любыя дзеянні з курыльнымі сумесямі, якія змяшчаюць забароненыя псіхатропныя рэчывы, цягнуць за сабой крымінальную адказнасць — пазбаўленне волі тэрмінам да 15 гадоў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

1944-2014 70 гадоў вызвалення

# «МЫ ЖЫЛІ Ў НЕЙМАВЕРНЫМ СТРАХУ», або Распавед пра параненае дзяцінства

**Буйна і дружна цвітуць сёлета сады... Цішыня і спакой навокал. Мы сядзім каля дома Зінаіды Аўяр'янаўны Комбар і нетаропка вядзём гутарку. Зінаіда Аўяр'янаўна — інтэлігентная мілавідная жанчына з разумнымі добрымі вачыма, шчырай усмешкай і цеплынёй у голасе. Не многія ведаюць, якія жахі ваеннага ліхалецця выпала ёй зведаць ва ўзросце ўсяго толькі васьмі гадоў.**

Нарадзілася і гадавалася Зінаіда ў сям'і настаўніка ў вёсцы Зеляніца. Населены пункт з усіх бакоў быў аточаны лесам. Жылі ў ім працавітыя людзі. Аралі зямлю, ладзілі вяселлі, гадавалі дзяцей, мелі забяспечаны побыт, дзяліліся адно з адным радасцю і шчасцем, разам перажывалі цяжкасці. Аднак вайна дакацілася і да гэтых мясцін. Мужчыны пайшлі на фронт. Засталіся нямоглыя старыя, жанчыны і дзеці...

— Жылі мы ўвесь час у неймаверным страху, — распавядае Зінаіда Аўяр'янаўна. — Дрыжалі, думалі: вось зараз прыйдуць немцы і заб'юць нас. Мы ж былі сям'ёй партызана. Ворагі лютавалі ў навакольных вёсках. Маці часта выпраўляла мяне з хаты, казала: «Ідзі, схавайся ў людзей, хоць хтосьці застанецца жывым». Аднойчы з маленькай сястрычкай Людай на руках (яна нарадзілася 22 верасня 1941 года) я папрасілася да суседзяў. Прытуліла нас шматдзетная сям'я. Тут мы часта хаваліся ў час небяспекі. Калі 15 чэрвеня 1942 года немцы сталі паліць вёску Боркі, жыхары Зеляніцы вельмі напалохаліся. Паміж вёскамі ўсяго толькі 7 кіламетраў. Клубы чорнага дыму пагрозліва ўзнімаліся над лесам і наводзілі жах. Хутка пайшла пагалоска, што Боркі спалілі разам з яе насельнікамі.

Схапіўшы сякі-такі свой няхітры набытак і жывёлу, людзі з Зеляніцы хуценька пакінулі вёску і схаваліся ў лесе. Застаўся толькі стары дзед. На новым месцы жыхарства людзі ўладкоўваліся, хто як мог. Некаторыя змайстравалі з жэрдак і яловых лапак буданы, іншыя выкапалі зямлянкі. Аднак большасць жанчын і дзяцей сядзелі пад густымі ялінамі, накрыўшыся посцілкамі.

Ваду для піцця бралі з балота. Яна была рыжая, пахла тваннню. Ад смагі пілі і такую, і ніхто не хварэў. Пагрозу і небяспеку адчувалі не толькі дарослыя, але і дзеці, і жывёла: малыя — не плакалі, каровы — не рыкалі...

— Праз пэўны час мы вярнуліся ў Зеляніцу. Ад вёскі засталася толькі назва... Немцы спалілі ўсё. Згарэў у сваёй хаце і той адзінокі дзед, які не пайшоў хавацца ў лес. Суседзі сабралі яго костачкі ў посцілку і ў глыбокай жалобе пахавалі на могілках, — распавядае Зінаіда Аўяр'янаўна.

Там-сям у людзей засталіся цэлымі хлеўчыкі, лазні, стопкі. Вось у іх і сяліліся. З усяго падворка сям'і Зінаіды захавалася лазня, якая і стала іх хатай. За сувязь з партызанамі Зеляніцу, нават спаленую і загубленую, немцы не пакідалі ў спакоі: часта наляталі самалёты, бамбілі, стралялі з кулямётаў. Гінулі мірныя людзі, дзеці. Аднойчы над лесам, над спаленай вёскай з'явілася «рама» (нямецкі двухфюзеляжны самалёт-разведчык «Фоке-Вульф»). Гэта быў самы небяспечны і бязлітасны самалёт. «Рама» так нізка лятала, што пругкая паветраная хваля валіла з ног. «Рама» выглядвала, вынюхвала, шукала чалавека, каб забіць яго... З самалёта пачалі ляцець бомбы. Адна бомба трапіла ў лазню, дзе жыла Зіна з сям'ёй — і іх апошняга прытулку не стала. А фашысцкі сцярвятнік яшчэ ў дадатак паліваў безабаронных людзей кулямётным агнём.

**Пагрозу і небяспеку адчувалі не толькі дарослыя, але і дзеці, і жывёла: малыя — не плакалі, каровы — не рыкалі...**

Зінаіда Аўяр'янаўна прызнаецца, што нават цяпер, калі глядзіць па тэлевізары фільмы пра вайну і бачыць гэтую злавесную «раму», ёй становіцца вусцішна, мароз паўзе па скуры, хочацца куды-небудзь схавацца.

— Запомнілася і такая падзея, — распавядае Зінаіда Аўяр'янаўна. — Зрабілі аброк: за адзін дзень напралі з кудзелі нітак, выткалі палатняны ручнік, выбелілі яго, вышылі каляровымі ніткамі і завязалі, як абярэг, на крыж, што стаяў ля дарогі ў вёску. 30 сакавіка (я гэты дзень добра запомніла) на велізарных машынах з аўчаркамі немцы зноў рынуліся на Зеляніцу, каб канчаткова знішчыць яе жыхароў. Страляніна, выбухі гранат, брэх сабак, крыкі і лямант запаланілі наваколле. І раптам нечакана паваліў такі густы пушысты снег, што за два крокі не было нічога відаць. Вялікія шматкі снегу запоўнілі ўсю прастору між небам і зямлёй. Сцямнела. І ў гэтай снежнай смузе людзі кінуліся ўцякаць у лес. Аўчаркі след узяць не змаглі. Прырода і Бог уратавалі нас. Пад густой разгалістай елкай, падаслаўшы яловыя лапкі, мы сядзелі ў вялікай роспачы і адчаі. І раптам з'явіўся бацька. Ён завёў нас на глухі хутар Хонава, дзе мы жылі некаторы час. Пасля яшчэ доўга даводзілася блукаць па лесе, па балотах, ратуючыся ад блакады, уцякаць ад пагоні. І, як ні дзіўна, усюды мы вадзілі за сабой кароўку. Яна была ў нас спакойная, рахманая, разумная. У халодныя золкія ночы ў лесе клаліся ля каровы — яна сагравала нас. Удзень даілі рагулю — яна карміла нас.

Асабліва запомнілася Зінаідзе, як пасля доўгіх блуканняў і пакут яны дабраліся да Клічава, дзе была аднаўлена савецкая ўлада — партызанская зона. На вуліцах Клічава было чыста, светла, прыгожа. Над галоўным будынкам райцэнтра лунаў чырвоны сцяг... Ішоў сакавік 1944 года. Фронт стаяў ужо пад Рагачовам. Набліжаўся час вызвалення. Адчуваючы свой блізкі канец, немцы лютавалі яшчэ больш. Пачаліся шматлікія карныя аблавы і блакады. Партызанскае камандаванне вырашыла адправіць дзяцей за лінію фронту. Ва Усакінскім лесе размяшчаўся партызанскі аэрадром. Глыбокай цёмнай ноччу на лёгкі самалёт-«кукурузнік» пасадзілі дзяцей, пагрузілі параненых. Ляцелі над тэрыторыяй, занятай пакуль што ворагам. Унізе — полымя пажараў, водбліскі гармат і выбухаў. Асабліва страшна было, калі падляталі да лініі фронту. Каб не быць пачутымі на зямлі і не трапіць пад агонь варожых зенітак, лётчык выключыў матор. Самалёт працягваў ляцець па інерцыі, павольна зніжаючыся. Дзецям было вельмі страшна. Яны туліліся адно да аднаго і маліліся Богу, каб толькі жывымі даляцець да месца прызначэння. Цемру неба паласавала святло пражэктараў, сігнальных ракет. Дзякуй Богу, самалёт пераляцеў лінію фронту, зноў загудзеў матор. І праз нейкі час пасажыры апынуліся на вольнай, вызваленай ад фашыстаў зямлі.

Цяжкія выпрабаванні вайной прымусілі дзяцей рана пасталець, навучылі цаніць жыццё ў розных яго праявах. Усталяваўся мірны час. Зеляніца адбудоўвалася, залечвала раны. Зінаіда з сярэбраным медалём закончыла Кіраўскую сярэднюю школу і адразу ж паступіла на філалагічны факультэт БДУ. Вучыцца сярод моладзі, якая таксама зведала ўсе цяжкасці вайны, было цікава. На факультэце панавала творчая атмасфера. Цэлую плеяду яркіх самабытных талентаў песціў тады ўніверсітэт. На трэцім курсе вучыўся Ніл Гілевіч, які ўжо актыўна друкаваўся. На першым шчыраваў, набіраў сілу Рыгор Барадулін. Разам з імі на літаратурных вечарах неаднойчы даводзілася выступаць і Зінаідзе Аўяр'янаўне. Барадулін натхнёна чытаў свае вершы, яна — прозу. На аддзяленні журналістыкі вучыліся вядомыя хлопцы: Іван Пташнікаў, Іван Чыгрынаў, Давід Сімановіч... Выдатныя выкладчыкі, творчыя сустрэчы, стасункі з будучымі «зоркамі» беларускай літаратуры і журналістыкі — такому асяродку можна было толькі пазайздросціць...

Пасля заканчэння ўніверсітэта яна працавала ў школах Бабруйскага раёна, а з 1964 года і да выхаду на заслужаны адпачынак — у Любоніцкай сярэдняй школе. Выкладала рускую і беларускую мову і літаратуру, замежную мову, была намеснікам дырэктара школы па вучэбна-выхаваўчай рабоце. За плённую творчую працу Зінаіда Комбар была ўзнагароджана граматамі, мае дзяржаўныя ўзнагароды. У настаўнікаў і вучняў яна была аўтарытэтам. І сёння былыя выпускнікі школы часта тэлефануюць ёй, просяць парады, віншуюць са святамі, запрашаюць на традыцыйныя школьныя вечары... А адзін з былых вучняў Віктар Худавец (выдатны майстар, рэзчык па камені) падарыў Зінаідзе Аўяр'янаўне свой зборнік вершаў «У святой цішыні» — з пранікнёным надпісам і ўдзячнасцю настаўніцы, якая падтрымала і натхніла яго на паэтычную творчасць.

У аграгарадку Любонічы Зінаіда Аўяр'янаўна — паважаны чалавек, добразычлівая і ўважлівая дарадчыца для суседзяў, цікавая суразмоўца. Яна заўжды адкрытая для людзей. Уласныя дзеці яе таксама ўладкаваны. Сын Аляксандр скончыў Маскоўскі авіяцыйна-тэхналагічны інстытут, жыве і працуе ў Маскве. Дачка Галіна — у бібліятэчнай сістэме горада Віцебска.

Сама ж Зінаіда Аўяр'янаўна шчыра моліцца і дзякуе Богу — за тое, што захаваў ёй і яе родным жыццё ў гады ваеннага ліхалецця. А таксама за супакой тых, хто не дажыў да Дня Перамогі.

**Міхась АЛЕЙНІКАЎ,**
*Кіраўскі раён.*

■ На свае вочы

# ХАЦЕЦЬ НЕ ШКОДНА,
## або Як трапіць «у тэлевізар»

**На мінулым тыдні тэлеканал «Беларусь 2» прадставіў прэм'еру праекта «Хачу ў тэлевізар». Тут кожны ахвотны можа стаць «зоркай» эфіру: перад камерамі можна агучыць свае цікавыя ідэі, пазнаёміцца з апантанымі людзьмі і скарыстаць шанц заявіць пра сябе на ўсю краіну. Днямі ў студыі Белтэлерадыёкампаніі прайшоў ужо трэці кастынг для прэтэндэнтаў. Карэспандэнты «Звязды» паназіралі за ўдзельнікамі, пакуль журы шукала новыя кадры ў каманду прафесіяналаў…**

### ДРУГОГА ШАНЦУ НЕ БУДЗЕ?

Частка прэтэндэнтаў на тое, каб трапіць у тэлевізар, ужо чакае пад дзвярыма студыі, нехта яшчэ ў грымёрцы, а мы пераступаем за першым удзельнікам парог, дзе чакае здымачная група. Хлопцу чапляюць мікрафон-пятлічку і запрашаюць у кадр.

— Мяне завуць Міша Янчанка, мне 30 гадоў, і я прадстаўляю горад Гомель. Жанаты, маю сына, — ёсць вялікае жаданне падзяліцца ведамі з тэлегледачамі. Два гады таму ў нас адкрыўся інтэрнэт-канал і руская версія каментавання матчаў ляжала на маіх плячах. Тады і задумаўся, а чаму б не паспрабаваць паўдзельнічаць у нейкіх конкурсах, звязаных менавіта са спортам. Летась я ўдзельнічаў у конкурсе на каментатара, але першы плод — за плот, таму сёння я тут. Калі не прайду? Гэта творчы працэс, і насамрэч ніколі не варта спыняцца і апускаць рукі: сёння ты не падыходзіш, але калі працягваеш працу над сабой, то праз год можа з'явіцца яшчэ адна магчымасць.



Кацярына Патоцкая: «Хачу, каб спраўдзілася мая мара пра эфір!»

— расказвае пра сябе прэтэндэнт. — Прымаю ўдзел у гэтым конкурсе, бо хацеў бы заняць на вакансію спартыўнага каментатара.

Камісія падтрымлівае Мішу і прапануе паспрабаваць сябе ў запаветнай ролі ў тую ж хвіліну. Паколькі нашаму герою падабаецца хакей, то і трансляцыю ён умоўна вядзе з хакейнага спаборніцтва.

— Увага! Увага! Працуюць усе цэнтральныя тэлеканалы, — не губляецца хлопец. — З вясенняга горада Мінска тэлеканал «Беларусь 2» вядзе прамую тэлетрансляцыю гульні паміж зборнымі Расіі і Фінляндыі…

Як потым падзяліўся хлопец у асабістай размове, жаданне прыйсці сюды не было спантанным, і здзейсніць сваю мару ён спрабуе не ўпершыню:

— Апошнія 14 гадоў я працаваў у хакейнай сферы — быў хакейным агентам, асістэнтам генеральнага менеджара ў клубе, меў нават вопыт каментавання матчаў, таму

Вось ужо рэжысёр змяняе ўмовы, і новаспечанаму каментатару трэба ўявіць сябе на футбольным матчы. Так у момант мы аказваемся на стадыёне «Дынама». Дарэчы, прызнаўся Міша журы, на чэмпіянаце свету па футболе ён будзе перажываць за зборную Германіі, бо сам родам з Патсдама і сімпатызуе гульцам гэтай каманды.

— Выдатна, дзякуем! Глядзіце сябе ў тэлевізары ў эфіры «Беларусь 2» бліжэйшым часам.

Дзяніс з Жодзіна падаў заяўкі быць вядучым адразу ў трох праектах, якія сёння ідуць на «Беларусь 2» — «Раніца на Беларусь 2», «Імперыя песні» і «Вышэй за дах», аднак потым перадумаў «мерацца прафесіяналізмам» з Віталем Карпанавым. На пытанне, чаму выбраць вядучым трэба было б яго, хлопец адказаў у вершах: «Талант родился у меня, // Я знал что все меня заметят, // Горел, как пламя у огня, // И словом бойко я ответил…»

— У вас тэхнічная адукацыя, а вы лірык! — замест адзнакі выказаўся нехта са здымачнай групы. Хлопец тлумачыць такое спалучэнне коратка:

— Часам людзьмі рухае безвыходнасць. Я, калі шчыра, не люблю дзве рэчы — нечаканасці і абставіны. І сам па сабе крыху высакамерны.

Дзянісу прапанавалі ўявіць, што яму патэлефанавалі сярод ночы і прапанавалі весці эфір, які пачнецца праз 15 хвілін, — каб праверыць, ці гатовы той паступіцца сваім ганарам дзеля мэты.

— Скажу, што змагу толькі праз паўгадзіны, альбо наогул адмяню заявачку. Трэба загадзя папярэджваць што, дзе і калі будзе, — тлумачыць сваю пазіцыю прэтэндэнт. Чарговыя некалькі пытанняў, і на развітанне чуецца «Усяго найлепшага!».

### ЭКСТРЫМ І КАНКУРЭНЦЫЯ

Прыцягвае маю ўвагу і прыгожая дзяўчына (хоць дзяўчаты там усе былі прыгажуні) мадэльнай знешнасці. Кацярына, як аказалася, заўжды марыла трапіць на тэлебачанне: «Гэта мая мара з дзяцінства. І мне здаецца, чалавек, які яе рэалізуе, больш аддадзены будзе працы, чым проста людзі з добрай знешнасцю і выдатнай дыкцыяй».

— Ваша мара толькі што здзейснілася, — заўважае рэжысёр.

— Хацелася б затрымацца, — крыху губляецца прэтэндэнтка. Але зноў бярэ сябе ў рукі, распавядаючы, якую праграму хацела б весці:

— Мне падышла б любая тэматыка, але больш блізкае — тое, што датычыцца стылю, прыгажосці.

Пазней цікаўлюся ў дзяўчыны, што адчувала, апынуўшыся перад камерай?



Міхаіл Янчанка: «Паверце, мне ёсць што расказаць пра хакей!»

— Адрэналін неверагодны, быццам руку ў кіпень апусціла. Хвалявалася, — прызнаецца Каця.

…Нехта з удзельнікаў прапанаваў зрабіць перадачу для дзяцей, іншыя прэтэндавалі на музычна-забаўляльныя праекты. А вось пільнае вока тэлекамеры засяродзілася на хлопцу ў фартуху.

Хлопец адразу пачынае з прэзентацыі і сябе, і сваёй ідэі:

— Усіх вітаю! Вось і ў Алены Спірыдовіч з'явіўся новы калега. Мяне завуць Уладзімір Валасных, — трымаецца мужна юнак перад камерай. — Калі гаворыш пра беларускую кухню, то самае складанае — не выкарыстаць ужо ў першым сказе слова «бульба». Бачыце, і ў мяне не атрымалася…

Потым ён запрашае прыгатаваць дранікі. Не ведаю, як прысутным у камісіі, а мне захацелася хутчэй апынуцца дома і прыгатаваць смачную страву. Так, няхай не ўсё гладка атрымалася ў Валодзі, але тое, што рыхтаваўся, адчувалася. Можа, з часам і праўда трапіць у эфір «Беларускай кухні».

### ХОЧАШ ПАПУЛЯРНАСЦІ? ПРАЦУЙ НАД САБОЙ!

Гісторыя кожнага з 20 кандыдатаў па-свойму непаўторная. Нехта меў неблагую ідэю, але ніяк не мог уявіць сябе ў эфіры. Нехта верыў у чароўную сілу сваёй кашулі. Аляксандр Комар з Барысава прыйшоў на кастынг у яркім світары з вывай твару, які крыўляецца: «Мой выгляд дэманструе маё несур'ёзнае стаўленне да таго, чаго я ўжо дасягнуў. І імпульсам да сур'ёзнай працы магло б стаць тэлебачанне». Знаходзіліся і смелыя дзяўчаты, як Алена з Мінска, якая патлумачыла прычыну свайго прыходу лаканічна: «Хачу папулярнасці!» Коратка, ясна і шчыра.

— Чым часцей за ўсё «чапляюць» удзельнікі, калі ўлічваць, што гэта ўжо трэці кастынг?

**Алена з Мінска патлумачыла прычыну свайго прыходу лаканічна: «Хачу папулярнасці!»**

— Талентам, эрудзіраванасцю, а некаторыя яшчэ і абаяльнасцю. Але для працы нам вельмі патрэбна, каб быў талент добра размаўляць, рухацца і трымацца ў кадры. Безумоўна, калі нехта праявіць жаданне заспяваць, станцаваць ці паказаць яшчэ нейкі талент, то гэта толькі плюс, — адказвае кіраўнік праекта «Хачу ў тэлевізар», выканаўчы прадзюсар тэлеканала «Беларусь 2» Аляксей Нікончык. — Галоўная мая парада — рыхтуйцеся да кастынгу, каб маглі данесці да гледача свае ідэі, расказаць пра сябе і пра праект, які хочаце рэалізаваць. Толькі ад падрыхтаванасці залежыць тое, як той ці іншы чалавек будзе прадстаўлены ў эфіры.

З уласных назіранняў дадам: працуйце над сваёй мовай, майце на ўзбраенні скорагаворкі, вершы ці нешта яшчэ з вуснай творчасці і верце ў свае мары. Раней, як расказала здымачная група, тут і танцавалі, і спявалі, і на шпагат садзіліся — словам, паказвайце сябе па максімуме. Здзівіце рэжысёраў і сябе саміх. А тыя, хто ўжо паспрабаваў свае сілы, чакаюць чарговых выпускаў праекта на тэлеканале «Беларусь 2».

**P. S. Усю падрабязную інфармацыю аб праграме «Хачу ў тэлевізар» можна знайсці на старонцы праекта: http://www.belarus2.by/teleproekty/khochu-v-televizor.**

**Алена ДРАПКО**



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Аляксандр Комар: «Я амаль гатовы ўразіць журы».

■ Неасабісты суб'ектыў



# АДВАРОТНЫ БОК ДАСТУПНАСЦІ

## ЦІ ДАРАСЛІ МЫ ДА ІДЭАЛЬНАГА ГРАМАДСТВА, У ЯКІМ — «УРАД ДЛЯ НАРОДА»?

НЯДАЎНА ў сталічным тралейбусе выпадкова сустрэлася з земляком, хлопцам з суседняй вёскі, з якім (ён на некалькі класаў старэйшы) вучыліся ў адной школе. За амаль дваццаць гадоў, што не бачыліся, ён з худзенькага юнака ператварыўся ў мажнага чырванашчокага дзядзьку, поўнага бадзёрасці і здаровай сілы. У адчуваннях я не памылілася: у размове мой знаёмы пахваліўся, што працуе на будоўлі мулярам — праца, безумоўна, фізічна цяжкая, але ж і выгадная па грошах. І сыны, якія ўжо амаль дарослыя (аднаму дваццаць, другому васямнаццаць), па яго шляху пайшлі («Яны ў мяне здаровыя, як ласі, асабліва старэйшы», — хваліўся бацька). Карацей кажучы, усё ў яго добра, заставалася толькі парадавацца… І раптам… «Слухай, ты ж у газеце працуеш? Тут вось якая справа. Маёй старой у вёсцы трэба ганак зрабіць, разваліўся зусім, аступіцца яшчэ, нагу зломіць. Дый плот не пашкодзіла б новы загарадзіць — штыкеты пагнілі. А ў сельсавеце, паганцы, і не думаюць шавяліцца! Маці ўсё жыццё на ферме адпрацавала, жыве адна. То ты іх праз газету прапясоч — што гэта за няўвага да старога заслужанага чалавека!..»

Калі шчыра, мне напачатку проста мову адняло. Пасля, крыху ачомаўшыся, асцярожненька так спыталася: «Ты ж з сям'ёй да маці часта ездзіш?» «Ну, ездзім праз тыдзень». «І хлопцы ў цябе, дзякуй Богу, не інваліды, і сам на здароўе не скардзішся?» «Ну, я ж табе казаў». «І брат старэйшы, што ў адной вёсцы з маці жыве, таксама, здаецца, не інвалід?» «Не, на трактары працуе»… Пэўна, выраз твару быў у мяне яшчэ той, бо нарэшце да земляка дайшло: «А ганак ёй зрабіць усё роўна павінны! У нас дзяржава аб састарэлых клапоціцца. Дык чаму аб адных клапоціцца, а другія павінны самі спіну гнуць?» І потым гнеўна дадаў: «Не хочаш дапамагаць — не трэба! У нас вунь у раён хутка губернатар прыязджае. Да яго на прыём запішуся! Мы цяпер навучаны, дзе праўду шукаць!»

ГЭТЫ амаль кур'ёзны выпадак можна было б лічыць непаразуменнем і анекдотам, калі б ён быў адзінкавым. Спытайцеся ў любога чалавека пры пасадзе, які хоць раз праводзіў прыём грамадзян, — ён абавязкова прыгадае падобную гісторыю, і нават не адну, у розных версіях і інтэрпрэтацыях. Здаровыя нестарыя людзі прыходзяць прасіць дапамогі ў пытаннях, якія пры мінімальных намаганнях здольныя вырашыць самі (як у выпадку з маім знаёмым). Прычым лейтматывам гэтых просьбаў усё часцей гучыць: «Вы павінны!..»

Сапраўды, і Закон «Аб зваротах грамадзян», і Дырэктыва «Аб дэбюракратызацыі» зрабілі ўладу вельмі блізкай да людзей, такога, бадай няма ні ў адной краіне свету. Рэальна працуе славутае «Не народ для ўрада, а ўрад для народа» — тое, што яшчэ зусім нядаўна здавалася далёкай марай. Цяпер пры жаданні кожны без выключэння можа трапіць на прыём да адказнай асобы, напісаць скаргу ў любую інстанцыю з упэўненасцю, што яго зварот не пакінуць без увагі, бо — «павінны», бо — «не маюць права».

Толькі ёсць у гэтай бліскучай рэчаіснасці і адваротны бок медаля. Мы самі. Часам (гэта радзей за ўсё) проста недастаткова дасведчаныя, часам гультаяватыя, часам — нахабныя і хітрыя. Хтосьці ідзе патрабаваць, каб у старых бацькоў залаталі страху (а ў бацькоў — пяцёра дзяцей, і усе пры грашах і пры руках), хтосьці просіць павялічыць маці пенсію (а пасля становіцца вядома, што ён сам жа гэтую пенсію і прапівае), хтосьці проста хоча за нешта адпомсціць калегу або суседу — і піша ў розныя інстанцыі, што той… (варыянтаў безліч: ад гвалтавання малалетніх да вырабу самагону і парушэння правілаў супрацьпажарнай бяспекі). Ідуць і пішуць смела, бо строгае прававое поле не дазваляе таму, хто вядзе прыём ці чытае пошту, у вочы адказаць гультаю, што ён гультай, нахабніку — што ён нахабнік. З кожным зваротам трэба разбірацца дэталёва, наводзіць даведкі, ладзіць праверкі, пісаць адказы… А ў гэты час камусьці сапраўды дапамога жыццёва неабходная, а дзесьці сапраўды творыцца нешта супрацьзаконнае і небяспечнае — тое, па чым сапраўды трэба прымаць меры, дзеля чаго ўсё заканадаўства аб зваротах і аб блізкай да чалавека ўладзе і стваралася.

НЕЯК давялося размаўляць з кіраўніком аднаго з раёнаў Віцебшчыны. Ён расказаў аб сваім галаўным болі — перасяленцах. Ёсць у нас такія сем'і — перакаці-поле. Ім вельмі на руку аказалася, што тым, хто прыязджае працаваць у сельскую мясцовасць, выдзяляюць жыллё. Так і качуюць па ўсёй краіне — з адной вёскі ў другую. Прычым дармавое жыллё, якое атрымліваюць, лічаць часовым і ставяцца да яго адпаведна. Напрыклад, у адной такой хаце замест дроваў у печ пайшлі… дошкі ад падлогі. Калі ў хату па іх чарговай скарзе (здаецца, на тое, што страха працякае) зайшлі кантралёры, з печкі тырчалі рэшткі падлогі — «руплівыя» гаспадары тыя дошкі нават не пасеклі… Праз пару тыдняў яны звольніліся і з'ехалі — дзесьці цяпер, пэўна, «абжываюць» новую хату.

А гэты выпадак можна назваць амаль хрэстаматыйным: у адной вясковай школе вызвалілася пасада завуча. На яе прэтэндавалі дзве настаўніцы, і ў адной з іх былі прыёмныя дзеці. Тут жа ва ўсе інстанцыі — і ўлады, і апекі — на няшчасную пасыпаліся ананімкі: і дзяцей яна не глядзіць, і выпівае… І хоць усе (раён зусім невялікі) здагадваліся, адкуль у тых безыменных пісьмаў ды званкоў ногі растуць, усё роўна на кожны «сігнал» рэагавалі: «павінны», ды і справа сур'ёзная — прыёмныя дзеці. Урэшце шматлікія праверкі нічога не выявілі, але бедная кабета так ад іх стамілася, што сышла са школы ўвогуле. Вакантнае месца дасталася другой настаўніцы (ніхто ж не даказаў, што пісала ды званіла яна).

ТАК што да ідэальнага грамадства, дзе «ўрад для народа» народ (дакладней, даволі шматлікія яго прадстаўнікі) проста не дарос. Зрэшты, ёсць жа ў заканадаўстве паняцце «злоўжыванне ўладай». Можа, увесці па аналогіі паняцце «злоўжыванне даступнасцю ўлады»? Праўда, з пакараннем тут нашмат складаней. Хіба згрызоты ўласнага сумлення? Толькі ці шмат яго будзе ў вінаватых у наяўнасці?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 9 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.25** Зона Х.
**8.45** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.50** Уступныя іспыты па беларускай мове, рускай мове і матэматыцы ў V клас гімназій, гімназій-інтэрнатаў, гімназій-каледжаў мастацтваў.
**11.00** «Зорнае жыццё». «Топ зорак, якія абняславіліся». Частка 2-я.
**12.10** «Мая праўда». «На-На: Куміры з падваротні». Частка 4-я, заключная.
**13.15, 15.25 Меладрама «Сонечнае зацьменне». 1-я і 2-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.25** Нашы.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45** Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Выпрабаванне». «Крэпасць».
**22.15 Серыял «Чорныя коткі». 1-я і 2-я серыі.**
**0.10** Актуальнае інтэрв'ю.
**1.00** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Адзін цень на дваіх». 1-я серыя.**
**10.40, 0.30 Серыял «Разведка».**
**11.35** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**12.15 Драма «У даліне Эла».**
**14.30** Дак. фільм «Жыццё».
**16.00, 23.50** Ток-шоу «Перазагрузка».
**16.45 Серыял «Тры талеры». 1-я серыя.**
**18.55, 22.45 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**19.55** «Суперінтуіцыя. Бітва полаў».
**20.55** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**23.45** Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.40, 18.20, 21.05, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.50, 18.30, 0.20** «Сімвалы эпохі». Ашчадная каса.
**8.25 Дзіцячы фільм. «Што ў Сенькі было».**
**9.35, 22.00** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.05, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**11.05, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Аскара Марыкса.
**11.30, 19.10** «Размаўляем па-беларуску».
**11.35** Канцэрт аркестра нацыянальных інструментаў «Терема».
**14.00 «Пётр І». Маст. фільм.**
**17.40** «Жывыя сведкі леднікоў». Дак. фільм.
**18.40** «Камертон». Журналіст, музыказнаўца Яўген Герашчанка.
**19.15** «Беларускі народны каляндар». Юр'еў дзень.
**19.30 «Бацькі і дзеці». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**22.30 «Душачка». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**9.55** Гандбол. ЧС-2015. Плэй-оф. Чарнагорыя — Беларусь. Мужчыны.
**11.25** Аўтаспорт. burn-Дрыфт. 2-і этап Prestigio — Усходнееўрапейскага чэмпіянату.
**13.00—21.00, 23.40** Тэніс. Турнір ВТА. Бірмінгем.
**21.00** Час футбола.
**21.45—23.40** Футбол. «На шляху да чэмпіянату свету». Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.10, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Час абедаць!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Смешнае і яшчэ смяшнейшае».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Аляксандр Чарвякоў. Абвінавачваецца бальшавік...».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** «Вайна машын».
**22.40 Камедыя «Дзевяць месяцаў».**
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 гадзіны».
**6.10, 17.20** "Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Такі лёс».
**12.30** «Чатыры вяселлі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.30** «Не хлусі мне!».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Мае цудоўныя...».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Баявік «Пасажыр 57».**
**21.55** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.20 Серыял «NEXT 2».**

### МІР

**5.00** «180 хвілін на снядане».
**8.15 Серыял «Фатограф».**
**10.00, 0.45 Маст. фільм «Каранцін».**
**11.30, 0.20** «Агульны інтарэс».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Служба даверу».**
**14.05** Дак. фільм «Таемныя знакі».
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Прыставы».**
**18.20, 2.35 Серыял «Гурт «Зэта».**
**21.20 Серыял «1814».**
**23.00** «Беларусь сёння».
**2.10 Серыял «Спальны раён».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** "Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.10** Навіны -- Беларусь.
**14.30** «Золата інкаў».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.45 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Чужое жыццё».**
**0.20** «Салам, настаўнік!».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** "НТБ раніцай».
**8.45** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Ікраны барон».**
**21.20 Серыял «Лягавы».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «Дазнаўца-2».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.30, 19.00, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.10** «Мультпарад».
**7.30 Меладрама «Няверная».**
**9.35, 17.55 Серыял «Рэванш».**
**10.20 Трылер «Тормаз».**
**11.50 Камедыя «Бландзінка ў законе».**
**13.35 Пуаро Агаты Крысці. «Радоскі трохвугольнік».**
**14.30 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.45** «Кінаблакнот».
**19.05 Серыял «Добрая жонка».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Праклён залатой кветкі».**
**23.10 Серыял «Да смерці прыгожая».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00 Серыял «Свацця».**
**12.00, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**13.00** «Кіно ў дэталях».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Баявік «Канец гульні».**
**18.30, 0.30** «Лаві момант».
**19.00 Серыял «Нефармат».**
**21.10 Меладрама «Аднакласніцы».**
**23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Назіральнік».
**10.15 Серыял «Пэры Мэйсан».**
**11.05** Да 70-годдзя Давіда Галашчокіна. «Лінія жыцця».
**12.00, 16.50** «Сусветныя скарбы культуры».
**12.15** «Сталіца лялечнай імперыі». Дзяржаўны акадэмічны цэнтральны тэатр лялек імя С. Абразцова.
**12.40 Маст. фільм «Дні Турбіных». 1-я серыя**
**14.10 Маст. фільм «Прывалаўскія мільёны».**
**17.10** «Паліглот». Хіндзі з нуля за 16 гадзін! № 9.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Дак. фільм «Штодзённы ўрок...».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** «Добрай ночы, малыя!».
**19.50** «Лінія жыцця Маі Плісецкай».
**20.50** «Булату Акуджаве прысвячаецца...». Канцэрт у Перадзелкіне.
**22.20** Дак. фільм «Вальтэр».
**22.50 Маст. фільм «Падарожжа».**
**0.30** «Pro memoria». «Танец».
**1.35** П.І. Чайкоўскі. Варыяцыі на тэму ракако.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Брэйн-рынг». Фінал. 1993 год.
**5.50** «Ранішняя пошта». 1988 год.
**6.25** «Чараўнік 20-га стагоддзя — Кіа-100». Магічны гала-канцэрт. 1994 год.
**7.40** Фільм-канцэрт «Фестываль у Сан-Рэма».
**8.50** Фільм-спектакль «Дамы і гусары». 1-я частка.
**10.00** «50/50». 1994 год.
**11.00** «Кінасерпанцін». 1990 год.
**11.50** «Блакітны агеньчык». 1966 год.
**12.50** Фільм-спектакль «Майстар і Маргарыта». 1-я частка. 1989 год.
**14.25** «Бліц». 1990 год.
**15.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1989 год.
**16.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**17.00** «...Да 16 і старэйшым». 1989 год.
**17.50** «У свеце жывёл». 1991 год.
**18.40 Маст. фільм «І гэта ўсё пра яго». 1-я серыя.**
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Запрашэнне на вечар. Уладзімір Вінакур». 1988 год.
**23.00** «Для вас, бацькі». 1983 год.
**23.40** «Вароне дзесьці бог...». Дак. драма.
**0.10** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**0.20** «Пакуль усе дома». 1994 год.
**0.50 Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа № 5: «Дыназаўр». 1-я серыя.**
**3.00** «Колба часу».
**4.00** «Погляд». 1989 год.

### EUROSPORT

**9.30** Аўта- і матаспорт.
**9.45, 12.00, 0.00** Тэніс. Ралан Гарос. Фінал.
**11.00** Фехтаванне. Чэмпіянат Еўропы.
**13.15, 23.45** Веласпорт.
**16.00** Тэніс. Турнір АТР. Queen's.
**22.00, 2.00** Аўтагонкі.
**22.30** All Sports.
**23.30, 1.45** Футбол. Бразілеманія.
**1.30** Тэлечасопіс WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 9.15, 13.20, 16.20, 21.00, 2.00** Серыял «Няўдачнік».
**5.30, 7.10, 11.25, 18.55, 20.45, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**5.45** Камедыя «Маленькі прыбытак бацькі».
**7.25** Камедыя «План гульні».
**9.45** Камедыя «Закахацца ў нявесту брата».
**11.45** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**14.20** Камедыя «Прынц і танцорка».
**17.20** Камедыя «Закаханы і бяззбройны».
**19.20** Камедыя «Спатканне».
**22.10** Камедыя «Фантоцці 2000: кланаванне».
**23.45** Камедыя «Жанчына».
**0.15** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**3.00** Камедыя «Бамбу».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**9.15, 18.30, 3.50** Серыял «Небяспечнае каханне».
**10.45** «Паненка і кулінар».
**11.15** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**12.15, 17.30** Дак. серыял «Справа Астахава».
**13.10, 17.00** Дак. серыял «Простыя складанасці».
**13.45** «Жонка. Гісторыя кахання». Вера Васільева.
**15.10** «Сто пытанняў даросламу». Уладзімір Мяньшоў.
**16.00, 22.10** «Зорныя гісторыі».
**20.10** Серыял «Зонентау».
**21.10, 5.15** Серыял «Агент».
**23.00** Маст. фільм «Вецер, які калыша верас».
**1.10** Серыял «Хадзячыя мерцвякі».
**1.50** «Асцярожна, махляры!».
**2.15** «Часова даступны». Уладзіслаў Трацціяк.
**3.10** «Без падману».

### ТБ1000

**5.20** Драма «Чароўная краіна».
**7.35, 15.20** Драма «Знайсці Форэстэра».
**9.15, 16.55** Камедыя «Патрыманыя львы».
**11.20** Камедыя «Слава».
**13.30** Камедыя «Юнацтва, якое бунтуе».
**19.00** Драма «Асабістае».
**21.05** Драма «Простыя ісціны».
**22.50** Драма «Дзівоснае спрыянне».
**1.10** Камедыя «Ідэальны мужчына».
**3.10** Баявік «Нацыянальная бяспека».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».
**7.20** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
**8.40** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Кароль шантажу».
**10.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Смяротная схватка».
**11.20** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Паляванне на тыгра».
**12.40** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Сабака Баскервіляў».
**15.35** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».
**18.20** Камедыя «Спатканне».
**20.00** Камедыя «Гульня».
**21.45** Драма «Высоцкі». Дзякуй, што жывы».
**0.10** Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
**2.00** Камедыя «Заза».
**4.00** Баявік «Брат».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00** Гульні розуму.
**7.00** Займальная навука.
**8.00, 13.00** Ад Дня «Д» да Парыжа.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00, 18.00** Золата Юкана.
**12.00** Выпрабуйце свае мазгі.
**15.00** Замбезі.
**16.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**17.00, 2.00** Паветраныя асы вайны.
**19.00, 0.00, 3.00** Космас.
**21.00, 1.00, 4.00** Гульня ў лікі.
**22.00** Навука будучыні.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**7.50, 12.20, 23.00** Голыя і напалоханыя.
**8.40, 20.35** Патрабуецца зборка.
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Грошы ў засеках.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.00, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Горш быць не магло.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Чэмпіянат свету па футболе.
**19.10** Круцей не прыдумаеш.
**21.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**22.00** Смяротныя астравы.
**0.00, 5.10** Залатая ліхаманка.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

■ З іншага боку...

# МІКРАФІНАНСАВАННЕ: КАРЫСЦЬ АБО НЕБЯСПЕКА?

## Патрабуецца рэгуляванне, але не праз забарону дзейнасці



**Тэма мікрафінансавання стала вельмі моднай і папулярнай у нашай краіне. Сёння ёсць шмат нараканняў як на работу крэдытных кааператываў, так і камерцыйных мікрафінансавых арганізацый. А як жа? Навіны прыходзяць самыя супярэчлівыя. То ў Гродна двое хлопцаў арганізавалі таварыства з абмежаванай адказнасцю па выдачы пазык пад працэнты і сталі «выбіваць» грошы праз пагрозы. Аднойчы нават вывезлі чалавека на могілкі і прымусілі капаць сабе магілу. То адразу два крэдытныя кааператывы фактычна банкроцяцца і не выплачваюць грошай укладчыкам. Кіраўніцтва пры гэтым увогуле падазраюць у махлярстве.**

### Усе грошы — бізнесу?

Менавіта на такім фоне ствараецца прававая аснова для дзейнасці мікрафінансавых арганізацый у Беларусі. Пасля ўзгаднення ў Адміністрацыі Прэзідэнта праект нарматыўнага дакумента па пытаннях прававога рэгулявання прадастаўлення пазык і дзейнасці мікрафінансавых арганізацый атрымаў некалькі змяненняў. Напрыканцы мінулага месяца навацыі дакумента пералічыў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей ДУБКОЎ.** Самае важнае — пераарыентацыя мікрафінансавых арганізацый на прадастаўленне пазык суб'ектам малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, фізічным асобам, якія з'яўляюцца ўласнікамі маёмасці, заснавальнікамі (удзельнікамі), членамі камерцыйных арганізацый, а таксама пазык фізічным асобам, якія ажыццяўляюць рамесніцкую дзейнасць, дзейнасць у сферы аргаэкатурызму, вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі.

Цяпер МФА ў асноўным прадастаўляюць пазыкі на спажывецкія мэты. А пад мікрапазыкай будзе разумецца пазыка ў памеры да 15 тысяч базавых велічынь, а не 1,5 тысячы. Акрамя таго, мікрафінансавую дзейнасць змогуць ажыццяўляць толькі спажывецкія кааператывы, таварыствы ўзаемнага фінансавання, кааператывы другога ўзроўню, фонды, а таксама камерцыйныя арганізацыі, якія з'яўляюцца ламбардамі. Спажывецкія кааператывы не змогуць прадастаўляць пазыкі сваім членам на спажывецкія мэты.

### Чым адрозніваюцца крэдытныя кааператывы?

На мінулым тыдні мікрафінансавыя арганізацыі «заварушыліся» і пачалі абмяркоўваць сітуацыю. «Пры ўсіх супярэчнасцях паслугамі МФА ў краіне карыстаюцца тысячы людзей. Адна з галоўных прычын, чаму яны па грошы ідуць да іх, а не ў банк, — прастата і зручнасць», — сцвярджае **Алена КАЛЯДА, старшыня праўлення Рэспубліканскай асацыяцыі мікрафінансавых арганізацый.** Па яе словах, галоўнае адрозненне кааператываў ад камерцыйных арганізацый — нацыянальны характар: «Тут звычайна няма замежных грошай. Калі мы ўспомнім пра гісторыю польскіх кааператываў, то ў 1990-я гады, калі быў вялікі адток капіталу з краіны, менавіта ашчадныя касы сталі той асновай, дзякуючы якой палякі не згубілі свае зберажэнні. І сёння вельмі ганарацца гэтым. А чым адрозніваецца польская сістэма крэдытных кааператываў ад беларускай? На момант зараджэння гэтай з'явы ў нашых суседзяў было прынята выразнае заканадаўства. Таму для палякаў гэта вельмі надзейны фінансавы інструмент».

> **«У выніку канкурэнцыі ўсе будуць вымушаны знізіць стаўкі».**

Шчыра кажучы, паслугі кааператываў насамрэч карыстаюцца папулярнасцю. Аб гэтым гавораць лічбы, якія прыводзіць Алена Каляда: «У кааператывах, якія ўваходзяць у асацыяцыю, на 1 мая прынята 2 млрд рублёў. Выдадзена — 4 млрд. Такая вялікая розніца таму, што за 10 гадоў працы «Сталічны клуб узаемадапамогі» зарабіў пэўны прыбытак. І сёння мы маем магчымасць выдаваць пазыкі пенсіянерам не пад 10% у месяц, як усім, а пад 1%. Кааператыў з пачатку года выдаў каля 3 млрд рублёў. За 2013 год — 6,6 млрд. Бізнесу грошы выдае асобны кааператыў — «Сталічны клуб бізнесу».

### Што думаюць заёмшчыкі і ўкладчыкі?

Адзін з падманутых укладчыкаў Сяргей Радкевіч паведаміў гісторыю свайго знаёмства з мікрафінансавымі структурамі. «Першы раз сустрэўся з гэтым кааператывам на выставе. Гаваркі малады чалавек пакінуў прыемнае ўражанне. Пасля я схадзіў у офіс, паглядзеў дагавор. Аднак у ім былі граматычныя памылкі, што шмат аб чым гаворыць. Тады я рэціраваўся. Прыйшоў у іншы кааператыў. Усё было спакойна і без пафасу. Узнік давер — і я асмеліўся на размяшчэнне ўкладу. І застаўся задаволены. Праз тры месяцы атрымаў прыбытак і пакінуў грошы на яшчэ адзін тэрмін. У наступны раз у мяне грошы ўжо не прынялі, бо «не было магчымасці і неабходнасці». А гэта гаворыць аб адказным стаўленні да сваіх абавязацельстваў. І вось тады я зрабіў памылку — зноў пайшоў у той «дзіўны» кааператыў. Грошы мне дагэтуль не вярнулі. На сквапнасці чалавека вельмі ўмела гуляюць. Лічу, што вінаваты ва ўсім толькі я сам. Нельга ўсё звальваць у адну кучу, казаць, што ўсе яны там ліхвяры, махляры. Усё залежыць ад людзей. Можна любую добрую ідэю давесці да абсурду, але гэта не падстава яе забараняць. Колькі ў нас падманутых дольшчыкаў у долевым будаўніцтве — давайце тады перастанем будаваць жыллё. А колькі прадаецца нясвежых прадуктаў — давайце ўсе крамы пазакрываем».

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в годовой консолидированной финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годовой консолидированной финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, указанная выше годовая консолидированная финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка как банковского холдинга по состоянию на 1 января 2014 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении инструкции по составлению консолидированной финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года № 15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе», с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Поясняющий пункт*

Прилагаемая годовая консолидированная финансовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности Банка в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах помимо Республики Беларусь. Соответственно, прилагаемая годовая консолидированная финансовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годовой консолидированной финансовой отчетности требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в годовой консолидированной финансовой отчетности.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 26 октября 2011 года).

Грушевич Олег Владимирович
Аудитор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001794 от 26 февраля 2010 года, без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 52 от 7 сентября 2010 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 29 августа 2013 года).

Дата аудиторского заключения: 25 апреля 2014 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 25 апреля 2014 года.

Исполняющий обязанности
Председателя Правления
ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) В.К. Лиходиевский

Директор
ИООО «Эрнст энд Янг» П.А. Лащенко

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 7 июля 2014 г. ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества) | помещение неустановленного назначения 139 общей площадью 20,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58-139 (инвентарный номер 500/D-70772990) |
| Начальная цена | 402 848 100 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 40 000 000 белорусских рублей |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |
| Балансодержатель | СООО «Столичный центр» |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 7 июля 2014 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 09.06.2014 по 02.07.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 327-40-22 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

БЕЛАРУСБАНК

**СКИДКИ ПРИ ОФОРМЛЕНИИ МЕЖДУНАРОДНЫХ КАРТОЧЕК ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК»!**

***Оформите международную карточку в Беларусбанке, и Вы будете чувствовать себя комфортно в зарубежных поездках!***

В период с 06.06.2014 по 30.09.2014 снижена стоимость обслуживания международных карточек Visa Classic и MasterCard Standard:

| **Обслуживание международной карточки MasterCard Standard, Visa Classic со сроком действия 1 год** | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **основной:** | **Счет в USD** | **Счет в EUR** | **Счет в RUB** | **Счет в BYR** |
| - за первый год обслуживания | 10 долларов США | 8 евро | 330 рос. руб. | 90 000 бел. руб. |
| - за второй год обслуживания | 10 долларов США | 8 евро | 330 рос. руб. | 90 000 бел. руб. |
| - за третий и каждый последующий год обслуживания | 10 долларов США | 8 евро | 330 рос. руб. | 90 000 бел. руб. |
| дополнительной | 10 долларов США | 8 евро | 330 рос. руб. | 90 000 бел. руб. |
| **Обслуживание международной карточки MasterCard Standard, Visa Classic со сроком действия 2 года** | | | | |
| **основной:** | **Счет в USD** | **Счет в EUR** | **Счет в RUB** | **Счет в BYR** |
| - за первые два года обслуживания | 15 долларов США | 10 евро | 500 рос. руб. | 140 000 бел. руб. |
| - за каждые последующие два года обслуживания | 15 долларов США | 10 евро | 500 рос. руб. | 140 000 бел. руб. |
| дополнительной | 15 долларов США | 10 евро | 500 рос. руб. | 140 000 бел. руб. |

**ПУТЕШЕСТВУЙТЕ ЛЕГКО!**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

Лічыць страхавы поліс абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў серыі ВР нумар 5307022 несапраўдным у сувязі са стратай.

Утерянные бланки страховых полисов формы 2 РН, 2РП серии ББ №№ 0245090; серии НС №№ 0292842-0292843, 0299969, 0299971, 0301315, 0315077, 0328261, 0328273, 0328275-0328276, 0330548, 0332814, 0336043, 0336051, 0340687-0340690, 0340716-0340718, 0345729, 0346226, 0346269, 0348254, 0349033, 0349355, 0350944, 0351040-0351041, 0351178-0351180, 0352496, 0355055-0355057, 0356798, 0356809, 0356814, 0359287, 0360225-0360226, 0360237, 0360435-0360436, 0361260, 0362430, 0363931, 0363933, 0364941, 0367542-0367544, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительными.** *УНП 101063229*

## ОАО «Світанак» г. Жодино

**ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ**
в подрядных торгах на разработку строительного проекта с выделением очередей проектирования, на основании ранее разработанного архитектурного проекта:

«Реконструкция сооружений водоподготовки и очистки сточных вод ОАО «Світанак» по ул. 8 Марта, 1 в г. Жодино. Корректировка».

**Конкурсные предложения принимаются по адресу:** г. Жодино, ул. 8 Марта,1 до 10.00 7.07.2014 г.

**За дополнительной информацией обращаться по тел. 8 (01775) 3-36-29.** *УНП 600038919*

## ПРОЦЕДУРА ПЕРЕГОВОРОВ

ПО ВЫПОЛНЕНИЮ РАБОТ ПО ОБЪЕКТУ

**«Текущий ремонт эстакады участка по производству ингибированной соляной кислоты по адресу: инская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25»**

*с публикацией 6 мая 2014 признана несостоявшейся.*

«ОАО «Белхим» повторно приглашает принять участие в процедуре переговоров по выполнению работ по объекту «Текущий ремонт эстакады участка по производству ингибированной соляной кислоты по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25».

**Предложения принимаются до 14:00 11.06.2014 г. по адресу:** г. Минск, ул. Короля, 34, каб. №19.

**Справки по тел. 8017 204-85-17, факс 8017 204-85-19.** *УНП 100122846*

## ПОВТОРНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 июня 2014 года
проводит 11-ый повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности на 12 аукционе

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка, (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 175 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 152385 дв.735390 1990 г. 3 кат. 118755 км | г. Барановичи в/ч 29969 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 176 | Грузовой Урал-4320-0011-02 ш. 182545 дв. 838900 1991 г. 4 кат. 169452 км | г. Минск в/ч 39872 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 177 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 004949 дв. 0409039 1990 г. 3 кат. 103224 км | г. Минск в/ч 39872 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 178 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 0016991 дв. 748939 1988 г. 3 кат. 109182 км | г. Минск в/ч 39872 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 179 | Грузовой КрАЗ-255Б ш. 258437 дв. 0576 1976 г. 4 кат. 2341 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 38 000 000 | 3 800 000 |
| 180 | Грузовой КрАЗ-255Б ш. 259325 дв. 0699 1976 г. 4 кат. 6726 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 181 | Грузовой КрАЗ-255Б ш. 263654 дв. 0691 1976 г. 4 кат. 1680 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 182 | Грузовой КрАЗ-255Б ш. 278204 дв. 423050 1976 г. 4 кат. 1326 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 183 | Грузовой КрАЗ-255Б ш. 271408 дв. 18666 1976 г. 4 кат. 2350 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 42 000 000 | 4 200 000 |
| 184 | АТМЗ-5-4320-1012 (автотопливомаслозаправщик) с/о1301 на УрАЛ-4320-1012 ш. 026075 дв. 619374 1984 г. 4 кат. 61551 км | н.п.Михановичи в/ч 52188 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 185 | АТМЗ-5,5-4310 (автотопливомаслозаправщик) с/о890234 на КамАЗ-4310 ш. 0056945 дв. 0386657 1989 г. 4 кат. 53901 км | н.п. Михановичи в/ч 52188 | 125 000 000 | 12 500 000 |

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 20.05.14 № 91.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**
Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.

■ Калейдаскоп

# АД ВІЛІ ДА ФУЛЕКА

## ТАЛІСМАНАМІ ЧЭМПІЯНАТАЎ СВЕТУ ПА ФУТБОЛЕ БЫЛІ ЗВЯРЫ, ХЛОПЧЫКІ, АПЕЛЬСІН І... ІНШАПЛАНЕЦЯНЕ

**Як раней пісала «Звязда», талісманам сёлетняга чэмпіянату свету па футболе ў Бразіліі быў выбраны бранянасец Фулека. Ініцыятарам прыняцця такога рашэння стала адна з бразільскіх арганізацый, якія займаюцца аховай навакольнага асяроддзя. Яго імя ўтворана ад Fu (futebol — футбол) і leco (ecologia — экалогія). Наогул, пачынаючы з 1966 года, ні адзін чэмпіянат свету па футболе не абыходзіцца без талісмана. Кожная краіна-гаспадыня паспрабавала прыдумаць непаўторны вобраз-сімвал першынства планеты, які адлюстроўваў бы яркія і непаўторныя нацыянальныя асаблівасці прымаючага боку. Сёння мы вас з імі і пазнаёмім.**



**Вілі (1966, Англія).** На чэмпіянаце свету 1966 года многае адбылося ўпершыню. Упершыню тэлегледачы ўсяго свету змаглі назіраць за баталіямі галоўнага футбольнага турніру планеты ў колеры, упершыню Кубкам свету завалодалі родапачынальнікі футбола, упершыню менавіта англійскі чэмпіянат абзавёўся афіцыйным сімвалам — ім стала львяня Вілі. Не сказаць, праўда, каб брытанцы праявілі асаблівую фантазію. Жывёлу для талісмана доўга выбіраць не прыйшлося: леў традыцыйна асацыюецца з Брытаніяй і ўпрыгожвае нацыянальны герб і эмблему яе футбольнай асацыяцыі. Зрэшты, нягледзячы на відавочную банальнасць выбару, камерцыйную функцыю Вілі выканаў на «выдатна» — за час чэмпіянату прадпрымальныя англічане рэалізавалі цацачных ільвянят на суму больш за 6 мільёнаў фунтаў.



**Хуаніта (1970, Мексіка).** Арганізатары ЧС-1970, памятаючы аб поспеху львяняці Вілі, вырашылі замацаваць традыцыю і стварылі свой талісман. Радаваць публіку і зарабляць грошы адправілі хлопчыка Хуаніта. Хлопец, як сапраўдны мексіканец, быў апрануты ў зялёную форму нацыянальнай зборнай, а ад спёкі яго ратавала вялікае жоўтае самбрэра. Імя хлапчуку далі таксама нездарма: большасць мужчын у гэтай лацінаамерыканскай краіне завуць Хуан. Таму наваяўленага Хуаніта літаральна запоўнілі наваколлі стадыёнаў. Каб развіць поспех, арганізатары турніру зрабілі фотасесію футбалістаў-удзельнікаў у кампаніі з жывым талісманам.

**Ціп і Топ (1974, ФРГ).** Педантычныя немцы, ацаніўшы камерцыйны поспех Хуаніта, з чыста тэўтонскай логікай скапіравалі мексіканскую задумку. Але яны прадставілі на суд публікі не аднаго «тыповага нямецкага хлопчыка», а адразу двух. Ружавашчокія хлопцы Ціп і Топ, створаныя жыхаром Гельзенкірхена Ота Раўхе, сталі пераможцамі конкурсу сярод 10 000 патэнцыяльных талісманаў. Колькасць і сапраўды перарасла ў якасць: наведвальнікі чэмпіянату выдаткавалі на сімволіку з хлапчукамі каля 7,5 мільёна марак. Вядома, паўплывалі на гэта і поспехі зборнай ФРГ, якая выйграла другі чэмпіёнскі тытул.





**Гаўчыта (1978, Аргенціна).** Аргенцінцы, якім даверылі мундыяль 1978 года, у выбары талісмана відавочна кіраваліся меркаваннямі здаровага кансерватызму і пайшлі па пракладзенай сцежцы. Пастушок Гаўчыта, мяркуючы па знешнасці, прыходзіцца як мінімум стрыечным братам мексіканскаму Хуаніта. Розніца толькі ў адзенні: форму ён насіў ужо аргенцінскую і самбрэра змяніў на капялюш. У якасці доказу таго, што Гаўчыта — сапраўдны пастух, яго забяспечылі хусцінкай і жалейкай. Была ў хлопца і свая легенда: ён аказаўся сынам героя аргенцінскага эпасу пастуха гаўча, які, як сапраўдны Робін Гуд, абараняў усіх няшчасных і абяздоленых. Талісман нядрэнна адпрацаваў сваё: з яго дапамогай зборная Аргенціны ўпершыню заваявала чэмпіёнскі тытул.



**Наранхіта (1982, Іспанія).** Тэма няспелых юнакоў была закрыта іспанцамі. Арганізатары чэмпіянату свету 1982 г. ўпершыню выбралі талісманам не жывую істоту, а фрукт. Імя прыгажуна ўтворана ад слова «naranja», якое, не паверыце, перакладаецца як «апельсін». Выбар талісмана тлумачыцца проста: апельсіны, вырашчаныя ў Мурса і Валенсіі, — адны з самых салодкіх у свеце і лічацца лепшымі для выціскання соку. Іспанцы, якія гэтым ганарацца, не маглі не пахваліцца перад усім светам.



**Піке (1986, Мексіка).** Мексіканцы, творчай энергіі якіх 16 гадоў таму ледзь хапіла на хлопчыка Хуаніта, распісаліся ў немагчымасці самастойна прыдумаць яшчэ адзін талісман і звярнуліся па дапамогу да бразільскага жывапісца Жайме Парэду. Ён стварыў дастаткова сімпатычнага героя. Гэта перац, імя якога паходзіць ад слова «пікантэ» — «спецыі». Без самбрэра, праўда, і тут не абышлося. Нацыянальны капялюш разам з вусамі даў мясцовым жартаўнікам нагоду пазубаскаліць наконт таго, як цяжка склаўся лёс няшчаснага Хуаніта.



**Чао (1990, Італія).** Італьянцы адкрылі эпоху мутантаў, лагічна завершаную (спадзёмся) талісманамі лонданскай Алімпіяды. Сімвалам мундыяля на Апенінскім паўвостраве стала істота, якая чымсьці нагадвае кубік Рубіка або прымітыўны трансформер, размаляваная ў колеры італьянскага сцяга. Замест галавы ў яе футбольны мяч. Наконт імені мясцовыя дызайнеры таксама не вельмі доўга разважалі і назвалі сваё тварэнне адным з самых ужывальных слоў італьянскай мовы.



**Страйкер (1994, ЗША).** Амерыканцы падышлі да пытання стварэння талісмана максімальна адказна. У выніку аўтарам маскота (ад ісп. «талісман», «нешта або нехта, які прыносіць шчасце») стаў не хто-небудзь, а студыя Уолта Дыснея. Яна прадставіла на суд гледачоў сапраўды сімпатычнага сабачку ў майцы зборнай ЗША па імені Страйкер, якое можна перавесці як *нападаючы, забівала* ці *забастоўшчык*. Сур'ёзны падыход амерыканцаў прынёс плён — Страйкер стаў адным з самых «прыбытковых» талісманаў Кубкаў свету (прынёс стваральнікам больш за 11 мільёнаў долараў).





**Фуцікс (1998, Францыя).** Сімвал чэмпіянату свету 1998 г. вытанчаны і просты, як і ўсё французскае. Гальскі певень спакон веку сімвалізуе Францыю, таму пытанне аб тым, хто будзе талісманам, практычна не стаяла. Арганізатары чаканняў не падманулі і яшчэ за два гады да чэмпіянату прэзентавалі пеўніка па імені Фуцікс. Імя пеўня этымалагічна ўзыходзіць да слова «футбол» і тыповай канцоўкі гальскага імені (успомніце хоць бы Астэрыкса і Абелікса). Яго стварыў мастак з Бардо Франк Летары. Пацешны Фуцікс зрабіў мундыяль 1998 г. адным з самых рэнтабельных у гісторыі: ён прынёс французам прыбытак у памеры 27 млн долараў, а заадно і «начараваў» першае чэмпіёнства.

**Ато, Каз і Нік (2002, Карэя/Японія).** Змрочны азіяцкі геній вырашыў прадэманстраваць усяму свету сваё дамінаванне ў сферы высокіх тэхналогій. Вынікам гэтага памкнення стала з'яўленне на свет малазразумелых істот з яшчэ менш зразумелымі імёнамі. Паводле афіцыйнай канцэпцыі, аранжавы Ато, ружовы Каз і сіні Нік з'яўляліся іншапланетнымі гасцямі, якія прадстаўляюць сабой каманду па папулярным у іншых галактыках відзе спорту — атмаболе. У далейшым легенда абрастала падрабязнасцямі, і бліжэй да чэмпіянату было абвешчана, што Ато, Каз і Нік — гэта яшчэ і адна сям'я атмасферы. Гэтыя ідэі не дадалі троіцы прывабнасці ў вачах патэнцыяльных пакупнікоў, і іншапланецяне сталі самым камерцыйна няўдалым маскотам у гісторыі чэмпіянатаў свету. Адной з ускосных прычын гэтага стала яшчэ і тое, што па інтэрнэт-запыце «Ато» карыстальнікі адпраўляліся наўпрост на адзін з найбуйнейшых у свеце сайтаў для дарослых.





**Голеа VI і Піле (2006, Германія).** Немцы ўслед за мексіканцамі сутыкнуліся з неабходнасцю выбару талісмана для другога чэмпіянату. Як і лацінаамерыканцы, яны з задачай не справіліся. Правал папярэднікаў выразна намякнуў, што дызайнерам варта вярнуцца да традыцыйнай тэматыкі флоры і фаўны. Немцы так і зрабілі. Сімвалам чэмпіянату быў абраны чамусьці леў з састаўным іменем «Голе» — ад «гол» і «Леа», якому, як манарху, прысвоілі парадкавы нумар. Піле — вясёлы мячык, які ўсюды суправаджае Голеа. Здавалася б, бяспройгрышны варыянт, але стваральнікі канцэпцыі не ўлічылі моцнага бюргерскага патрыятызму. Па-першае, сімвалам Германіі традыцыйна з'яўляецца арол, а зусім не леў, і, да таго ж, леў ужо «талісманіў» у адвечных ворагаў-суседзяў — англічан. А па-другое, многіх збянтэжыла адсутнасць у наваяўленага Галіяфа… трусоў, і немцы западозрылі ў ім эксгібіцыяніста. Балельшчыкі абвясцілі талісманам байкот, а ў якасці замены абывацелі дружна аддалі перавагу альтэрнатыўнаму талісману ў выглядзе арляняці Паўле.









**Закумі (2010, ПАР).** Афрыканцы не спрабавалі вынайсці веласіпед і прадставілі свету вельмі мілага леапарда ў нейтральнай белай майцы. Цікавінкай стала загадка імені персанажа. Яно было створана з частак «ZA» — міжнароднага абазначэння ПАР — і «kumi», што з некаторых афрыканскіх дыялектаў перакладаецца як «10».

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**

■ Парады дарослым

# Ратуйце дзяцей правільна

**Доўгачаканыя летнія канікулы — не толькі радасць для дзяцей, але і дадатковы клопат для дарослых, якія павінны засцерагчы ад шэрагу непрыемнасцяў. У першую чаргу ад тых, якія пагражаюць здароўю. Парады дае ўрач-педыятр 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Любоў БАГАЧЭЎСКАЯ.**

### ЦЕПЛАВЫ ЎДАР

Нельга загараць, калі сонца знаходзіцца ў зеніце. Лепшы час — 10.00–12.00 і 16.00–18.00. Калі падчас сонечных ваннаў у дзіцяці павысілася тэмпература, з'явіліся слабасць і галаўны боль, неабходна тэрмінова адвесці дзіця ў цень, пакласці на твар сурвэтку, даць вады пакаёвай тэмпературы. Не рэкамендуецца ўжываць газіраваныя напоі.

### АПЁК

Першай ступені — пачырваненне скуры. Трымайце пацярпелае месца пад халоднай вадой да сцішвання болю. Апрацоўвайце некалькі разоў на дзень лячэбнымі аэразолямі кшталту «Пантэнолу», не накладвайце павязку.

Другой ступені — з'яўленне пухіроў. Пакладзіце на іх стэрыльную павязку (бінт або адпрасаваную тканіну), дайце дзіцяці шмат піць. Можна прыняць абязбольваючы сродак і паказаць урачу.

Нельга апрацоўваць скуру спіртам, адэкалонам, праколваць пухіры, мазаць скуру тлушчам, зялёнкай, марганцоўкай, пасыпаць парашкамі, зрываць адзенне, якое наліпла на месца апёку, дакранацца да яго рукамі.

### АТРУЧЭННЕ ЎГАРНЫМ ГАЗАМ

Такое атручэнне магчыма падчас работы бензінавых рухавікоў, згаранні прыроднага газу, падчас пажару. Угарны газ прыводзіць да вострага кіслароднага галадання. А таму пацярпелага заўсёды трэба спачатку вынесці на свежае паветра і пакласці на спіну гарызантальна. Расшпіліць адзенне і адкрыць грудную клетку. Напаіць гарачым салодкім чаем. На твар і грудную клетку папырскаць халоднай вадой або прыкласці мокры халодны ручнік.

На ўсякі выпадак майце на ўвазе, што памяшканні, якія загарэліся, задымленыя месцы заўсёды трэба праходзіць вельмі хутка, затрымаўшы дыханне, накрыўшыся шчыльнай тканінай, нагнуўшыся як мага ніжэй, таму што толькі каля падлогі захоўваецца крыху больш чыстага паветра. Калі загарэлася адзенне, ні ў якім разе нельга бегчы. Неабходна накінуць што-небудзь з адзення на гэты ўчастак, прыціскацца да сцен, падлогі — абмежаваць доступ паветра.

### УДАР МАЛАНКІ

Хуткасць маланкі — 100 тысяч км/сек, тэмпература — у 6 разоў вышэй, чым на паверхні Сонца. Таму тое, у што трапляе маланка, згарае. Патлумачце дзіцяці правілы паводзін і памятайце пра іх самі.

На адкрытым паветры: неабходна трымацца далей ад дрэў, дроту, металічных агароджаў. Ні ў якім разе нельга купацца падчас маланкі! Калі вы катаеце дзіця ў лодцы, плывіце хутчэй да берага.

На веласіпедзе: можна не злазіць, калі вы ў горадзе, бо дамы дзейнічаюць як громаадводы. Аднак калі катацца давялося на прыродзе, то лепш злезці, каб не прыцягнуць маланку ў якасці высокай кропкі на мясцовасці. Аўтамабіль жа пакідаць не трэба наогул — падчас грому ён бяспечны.

За камп'ютарам: маланка можа блакіраваць камп'ютар, інакш кажучы яна праходзіць і праз камп'ютар, і праз тэлевізар і можа іх разбурыць. Недастаткова выключыць толькі кнопку, трэба дастаць і штэпсель з разеткі.



Фота БЕЛТА.

З мабільнікам: мабільныя тэлефоны не прыцягваюць разрады маланкі. Трэба быць уважлівымі толькі з тэлефонным кабелем. Часам маланкі трапляюць у тэлефонныя сеткі жылля, і ток можа дабірацца да апарата. Можа ўдарыць токам, калі другой рукой дакрануцца да прадмета з добрай праводнасцю (халадзільнік, пральная машына і інш.).

### КІШЭЧНАЯ ІНФЕКЦЫЯ

Пастаянна сачыце за чысцінёй рук дзіцяці. Прывучыце мыць рукі дадаткова пасля вяртання з вуліцы або наведвання прыбіральні.

Давайце толькі свежыя і свежагатаваныя прадукты, мяса, рыбу, добра прыгатаваныя яйкі. Не давайце малочныя прадукты, набытыя ў прыватнікаў, без тэрмічнай апрацоўкі.

Сачыце за тым, каб прадукты захоўваліся не на стале, а ў халадзільніку. Звяртайце ўвагу на тэрміны прыдатнасці.

Ваду і малако давайце толькі пасля гатавання.

Фрукты і агародніну мыйце гарачай вадой, а лепш яшчэ і палівайце кіпенем.

Сырую і гатовую ежу наразайце на асобных апрацоўчых дошках.

Вучыце дзіця плаваць так, каб падчас купання вада не трапляла ў рот.

### УКУС КЛЯШЧА

Апрацоўвайце адзенне спецыяльнымі хімічнымі сродкамі падчас выездаў на прыроду. У лесе цела павінна быць максімальна схавана пад адзеннем.

Калі заўважылі на целе кляшча, завяжыце нітку як мага бліжэй да хабатка, кругавымі рухамі паціху асцярожна падцягвайце яго наверх. Апрацуйце месца ўкусу ёдам ці спіртам. Пакажыце дзіця ўрачу для прызначэння прафілактычнага лячэння.

### УКУС ЗМЯІ

Укус гадзюкі выклікае моцны боль. Чым вышэй тэмпература паветра, тым хутчэй развіваецца інтаксікацыя.

З ранкі ад укусу трэба высмактаць яд. Гэта нельга рабіць таму, у каго на губах ці ў ротавай поласці ёсць трэшчынкі, язвачкі ды ранкі. Мера эфектыўная толькі ў першыя 20–30 хвілін пасля ўкусу. Потым трэба змазаць месца ўкусу антысептыкам, накласці павязку. Пацярпеламу патрэбны поўны спакой, неабходна піць шмат вадкасці. Пасля аказання першай дапамогі трэба даставіць пацярпелага ў бліжэйшую медустанову.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

Даты | Падзеі | Людзі

**1799** год — 215 гадоў таму нарадзіўся Аляксандр Сяргеевіч Пушкін, вялікі рускі паэт. З імем Пушкіна ў беларусаў звязаны не толькі дзіцячыя ўспаміны, калі кожны з нас упершыню пазнаёміўся з пушкінскімі чароўнымі вершамі, казкамі і прозай, а потым і на ўсё жыццё ўлюбіўся ў іх. Нашчадкі генія жылі ў Беларусі і пакінулі на нашай зямлі свае сляды. Старэйшы сын паэта, Аляксандр, быў прафесійным ваенным — генералам ад кавалерыі. У 1860-я гг. Аляксандр Аляксандравіч знаходзіўся на службе ў Віленскай ваеннай акрузе. Герой руска-турэцкай вайны, узнагароджаны шматлікімі ордэнамі, залатой шабляй «За адвагу», ён камандаваў славутым 13-м Нарвскім гусарскім палком, створаным яшчэ ў пятроўскую эпоху. У 1870-я гг. полк быў расквatараваны ў Наваградку, дзе генерал Пушкін з сям'ёй жыў некалькі гадоў. Тут жа быў пахаваны яго маленькі сын Пётр. Магіла ўнука вялікага паэта на старых гарадскім могілках захавалася да нашых дзён. Унучка Наталля з мужам Варанцовым-Вельямінавым жылі ў маёнтку ў вёсцы Вавулічы пад Бабруйскам (цяпер гэта вёска Дубоўка). Тут Наталля Аляксандраўна пражыла каля 30 гадоў. Яна актыўна займалася дабрачыннасцю, вяла асветніцкую работу сярод сялян. На яе сродкі ў суседняй вёсцы Цялуша былі пабудаваны школа, царква. Наталля Аляксандраўна добра малявала, пісала вершы (праўда, ніколі не спрабавала іх надрукаваць) і нават уласнаручна ткала выдатныя палотны з беларускімі ўзорамі. Тут, на Бабруйшчыне, яна і памерла. У сям'і Варанцовых-Вельямінавых было шасцёра дзяцей. Усе яны выраслі ў маёнтку пад Бабруйскам. Сем'і ж праўнучак Пушкіна — Марыі і Соф'і — доўгі час жылі ў Бабруйску. Абедзве сям'і прымалі самы актыўны ўдзел у стварэнні Бабруйскай гарадской бібліятэкі. Праўнук паэта, Рыгор Рыгоравіч Пушкін, у гады Вялікай Айчыннай вайны ў складзе 1-й гвардзейскай дэсантнай дывізіі вызваляў Гродзеншчыну ад фашыстаў, быў намеснікам ваеннага каменданта горада Ліды.

**1874** год — нарадзіўся (горад Мінск) Канстанцін Сцяпанавіч Ерамееў, савецкі партыйны і ваенны дзеяч, журналіст. Працаваў у рэдакцыі бальшавіцкай газеты «Звезда». Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі быў адным з кіраўнікоў штурму Зімняга палаца. Удзельнічаў у падаўленні бунту Керанскага-Краснова, а таксама мецяжу «левых» эсэраў у Маскве. У 1919–1922 гг. быў упаўнаважаным УЦВК і ЦК РКП па мабілізацыі ў Чырвоную Армію. Адзін з арганізатараў Дзяржвыдата, рэдактар «Рабочей газеты», першы рэдактар часопіса «Крокодил» (1922–1928). З 1926 года — прадстаўнік гандлёвага флоту ў Францыі. У 1929–1931 гадах рэдактар часопіса «Красная нива». Памёр у 1931 годзе.

**1944** год — 70 гадоў таму на ўзбярэжжа паўночнай Францыі ўпалі тысячы снарадаў і бомбаў, а неба запоўнілі купалы парашутаў. Так пачалася самая вялікая падчас Другой сусветнай вайны дэсантная аперацыя, якая азнаменавала сабой адкрыццё 2-га фронту ў барацьбе з фашысцкай Германіяй. У адносінах паміж Савецкім Саюзам, Вялікабрытаніяй і Злучанымі Штатамі праблема 2-га фронту доўгі час была самым складаным пытаннем. У 1943 годзе на Тэгеранскай канферэнцыі саюзнікі, нарэшце, пагадзіліся далучыцца да баявых дзеянняў у Заходняй Еўропе. Тады рэшткі ўзброеных сіл Германіі былі расколаты, што значна аслабіла іх супраціўленне і паскорыла дзень Перамогі.



Было сказана

**Алесь СТАВЕР, паэт:**

*«Знаю я: абыдзі ўсю планету,*
*Але гэткай зямлі не сустрэць.*
*Беларусь. Край натхнення паэтаў!*
*Ды цябе немагчыма апець».*





**Значную частку іх існавання складае творчасць, але ім неабходна асцярожна абыходзіцца з унікальнай энергіяй, якую ім падаравала прырода. Яны жывуць асабістымі ідэямі, ім не застаецца часу на бясконцыя пошукі сэнсу жыцця. Ідэі і думкі гэтых людзей натхняюць тых, хто здольны іх зразумець. Яны адрозніваюцца рэвалюцыйнасцю, апантаныя жаданнем перабудовы існуючага ладу ў адпаведнасці са сваім бачаннем. Але вышэй за ўсё для іх стаіць свабода. Людзям гэтага дня неабходна навучыцца дзяліцца з навакольнымі сваімі думкамі і планамі.**




Дарагую, любую **Глафіру Міхайлаўну АТРАХІМОВІЧ** з в. Порплішчы Докшыцкага раёна віншуем з 77-годдзем.
Жадаем здароўя, дабрабыту, даўгалецця, удачы.
**Муж, 2 сыны, 2 нявесткі, унукі Алена з Каралінай, Каця з Дзімам, праўнукі Ксюша і Яраслаў.**


# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.41 | 21.36 | 16.55 |
| Віцебск — | 4.22 | 21.34 | 17.12 |
| Магілёў — | 4.31 | 21.27 | 16.56 |
| Гомель — | 4.36 | 21.14 | 16.38 |
| Гродна — | 4.58 | 21.50 | 16.52 |
| Брэст — | 5.07 | 21.41 | 16.34 |

## Месяц

***Першая квадра 5 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.***

## Імяніны

***Пр.** Івана, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
***К.** Марыі, Паўліны, Лаўрэнція, Нікіфара, Норберта, Сымона.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА





## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +21..+23°С | КІЕЎ +26..+28°С | РЫГА +19..+21°С |
| ВІЛЬНЮС +22..+24°С | МАСКВА +28..+30°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С |

УСМІХНЕМСЯ

## Сем прыкмет таго, што табе трэба пахудзець:

1. Табе пачаў цiснуць падпахамі і ў таліі твой аўтамабіль.
2. Бабуля падчас апошняга твайго візіту паглядзела на цябе і паставіла блінцы з мясам назад у халадзільнік.
3. Ты задыхаўся, проста намазаўшы батон маянэзам.
4. Бабулькі ў хустках пастаянна просяць у цябе благаславення.
5. У атэлях замест шакаладкі табе пакідаюць на ложку скакалку.
6. У складках жывата ты знайшоў бубновага туза і стары пульт ад «відзіка».
7. Ты не першы год працуеш у ДАІ.





caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.906. Індэкс 63850. Зак. № 2209.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 5 чэрвеня 2014 года.